СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск—7.01, 16.46, 9.45;
Віцебск—6.54, 16.32, 9.38;
Магілёў—6.50, 16.35, 9.45;
Гомель—6.46, 16.34, 9.48;
Гродна—7.18, 16.59, 9.41;
Брэст—7.12, 17.06, 9.54.
МЕСЯЦ:
Поўня 25 кастрычніка



ЗВЯЗДА

28 КАСТРЫЧНІКА 1992 г. серада, № 218 (21996)



● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

РОЗГАЛАС

БУДЗЕШ ХАРОШЫ—ДАДЗІМ ГРОШЫ

ТАЛАЧЫН. (Т. Махтадуй). Выканкам райсавета народных дэпутатаў з традыцыйным стылем «адгаварваў» на крытычную заметку ў «Звяздзе», у якой ішла гаворка аб незадавальняючай рабоце камунгаса і цэнтра гігіены і эпідэміялогіі па забеспячэнню належнай работы гарадской лазні, навя[illegible]дзенню санітарыі і парадку. Аўтара публікацыі запрасілі на пасяджэнне выканкома і абвінавацілі ў адсутнасці патрыятызму. Радактару райгазеты заявілі, што ад [illegible] раёну, [illegible] прыпынілі б адмовіцца. Дарэчы, гэта не першае напружанне. Мінулай вясной старшыня райсавета І. Шчурок не зайшоў, а літаральна ўварваўся ў рэдакцыю і спытаў: «Дзе зводка?» Атрымаўшы адмоўны адказ, у запале прамовіў: «Не атрымаеце грошай. Ніводнай капейкі. Нават не прасіце». А пасяўная [illegible] і палявыя работы ішлі ў поўным разгары.

[illegible]

Каб не сталі такімі ж драўлянымі

Беларускі ўрад вырашыў разгарнуць Барысаўскі папяровы [illegible] завод, вылучыўшы з яго папяровую вытворчасць. На яе аснове будзе створана фабрыка Дзяржзнака Беларусі з правамі юрыдычнай асобы, якая стане друкаваць каштоўныя паперы і, магчыма, новыя беларускія грошы.

Да гэтага часу Барысаў слаўціўся не толькі запалкамі, але і купюрамі. Галоўнае — каб яны не сталі такімі ж драўлянымі, іранізуе агенцтва РІД.

Перад паездкай у Польшчу рэкамендуем памыць машыну

Упраўленне ДАІ Рэспублікі Беларусь распаўсюдзіла цікавую навіну. Цяпер прадпрыемствы, арганізацыі і грамадзяне, якія маюць намер ажыццявіць паездку ў Рэспубліку Польшча, а таксама арганізацыі, якія праводзяць такія турыстычныя паездкі на аўтатранспарце, павінны [illegible] польскай дарожнай паліцыі і [illegible] Упраўлення па [illegible] пытаннях [illegible] Польшчы.

А яно [illegible] сродкаў транспарту, якія маюць тэхнічныя непаладкі, [illegible] шкодных рэчываў у выхлапных газах, а таксама дрэнны эстэтычны выгляд, уезд на польскую тэрыторыю будзе катэгарычна забаронены.

ГОЛАС З НІЖНЯЙ ПРЫСТУПКІ

БРЭСТ. Настаўнікі горада і вобласці рыхтуюцца падтрымаць ідэю рэспубліканскага страйка работнікаў адукацыі. Як вядома, прычынай для гэтай акцыі стала тое, што Савет Міністраў рэспублікі прапануе [illegible] увядзенне артыкула 34 Закона аб адукацыі, дзе гаворка ідзе пра павелічэнне заработнай платы. Яшчэ на пачатку кастрычніка ў Брэсце быў утвораны страйкавы камітэт настаўнікаў. Зварот камітэта быў падтрыманы на гарадской канферэнцыі педагогаў. На гэтым сходзе было выказана шмат папрокаў у адрас урада, палітыка якога ставіць настаўнікаў на ніжэйшую прыступку сацыяльнай лесвіцы.

Праўда, нельга сказаць, што настаўнікі выступаюць, як раней казалі, адзіным фронтам. Некалькі педагагічных работнікаў сярэдняй школы № 16 выйшлі з раённага прафсаюза. Яны лічаць, што прафсаюзы [illegible] не абараняюць інтарэсы работнікаў адукацыі і маюць намер стварыць незалежны прафсаюз настаўнікаў.

І. АРЛОЎ.

ЗНЯСЛА КУРЫЦА ЯЙЦО. САПРАЎДЫ, ЗАЛАТОЕ

У многіх, хто пазаўчора наведаў прадуктовыя магазіны, вочы ў прамым сэнсе слова палезлі на лоб. Не хвалюйцеся, паважаныя чытачы, размова пойдзе не аб чарговым павышэнні цэн на хлеб—«усяго толькі» падаражалі курыныя яйкі. Цяпер дзесятак гэтага каштоўнага калярыйнага прадукту ў мінскіх магазінах рэалізуюць па даволі «сімвалічнай» цане—90 рублёў. [illegible] «Можа, памылка выйшла?» [illegible] звярнуцца за тлумачэннем у Міністэрства гандлю РБ.

— Ініцыятыва павышэння цэн на яйкі, зразумела, ад Міністэрства гандлю рэспублікі не зыходзіла,— паведаміла [illegible] Любоў Андрэева.— [illegible]

[illegible] 75 рублёў, 2 катэгорыі — 66 рублёў 70 капеек, [illegible] — 62 рублі 50 капеек. Яйкі 1 катэгорыі на заводзе 58 рублёў 35 капеек, 2 катэгорыі—50. [illegible]

Ігар ШЧУЧЭНКА.



ІНТЭЛЕКТ КАНВЕРСУЕМЫ. ПРАЎДА, ПАКУЛЬ ШТО НЕ Ў НАС

У Мінску адкрылася выстаўка-сімпозіум «Інтэлектуальная канверсія». [illegible]

НА ЗДЫМКУ: [illegible]

Фота [illegible].

Замкнёнае кола вады

БАРАНАВІЧЫ. Раённая ЦЭЦ [illegible] у аварыйным рэжыме. Прычына — [illegible]

Парадаксальная сітуацыя: ЦЭЦ не можа нармальна працаваць [illegible]

А камуністы назіралі

БАРАНАВІЧЫ. У горадзе адбылася канферэнцыя дэмакратычных сіл, на якой прысутнічалі прадстаўнікі Беларускага народнага фронта, Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, Таварыства беларускай мовы, [illegible] Сялянскай партыі. [illegible]

Цікава, што на канферэнцыі прысутнічалі і мясцовыя камуністы. Праўда, не як удзельнікі, а як назіральнікі.

ХТО НА КАПІТАНСКІМ МОСЦІКУ?

126 з 208 дэлегатаў канферэнцыі працоўнага калектыву вытворчага аб'яднання «Электрамодуль» у Маладзечна выказаліся за недавер генеральнаму дырэктару аб'яднання. Усё б нічога, бо такім сёння мала каго здзівіш, каб не той факт, што ўсяго тры гады таму Віктар Андрэевіч Васько выйшаў пераможцам у выбарах з шасці кандыдатаў на пасаду генеральнага ў тым самым калектыве. У віну кіраўніку ставіцца сістэматычнае невыкананне калектыўнага дагавора.

Многа праблем у маладзечанскіх прыборабудаўнікоў, але як растлумачыць факт, што менш чым за год завод страціў значную частку вядучых спецыялістаў, большасць намеснікаў першага кіраўніка? Людзі па 2 месяцы знаходзяцца ў адпачынку, рабочы дзень пачынаецца а дзесятай гадзіне, а дзён такіх у тыдні ўсяго чатыры. Прадукцыя ж ідзе за межы рэспублікі часта проста без належнай аплаты. Неаднойчы дырэктар ставіў пытанне аб тым, што аб'яднанню не патрэбна прафсаюзная арганізацыя ў тым выглядзе, у якім яна сёння існуе. І ці не таму, што прафсаюз адным з першых стаў на абарону правоў работнікаў?

— Так, я капітан на караблі, — сказаў у адказ на рэпліку аднаго з выступаючых на канферэнцыі дырэктар. — Таму не згодных з маёй палітыкай чакае лёс кожнага не згоднага з курсам капітана члена экіпажа. Яго проста выкідаюць за борт, як баласт. Яшчэ больш рэзка выказаўся галоўны інжынер: «Гарачым жалезам мы будзем выпальваць усякую «самасційшчыну». Праўда, ён пасля папрасіў прабачэння за свае словы, але рабочы чалавек на «Электрамодулі» ўсё адно сваіх правоў пакуль не адчуў.

Рашэнне канферэнцыі носіць характар рэкамендацыі. Мабыць, у Дзяржаўным камітэце па дзяржмаёмасці задумаюцца над тым, хто знаходзіцца на капітанскім мосціку карабля з экіпажам ледзь не ў пяць тысяч чалавек?

Аляксандр МАНЦЭВІЧ.

«НАПЕРАДЗЕ ПЛАНЕТЫ ЎСЁЙ»?

«Ну давайце ў Канстытуцыю запішам, што кожны наш грамадзянін мае права лячыцца за мяжой. Хочаш — у Італіі, хочаш — у Францыі ці ў Ізраілі. Давайце?» — так іранічна адрэагаваў у сваім выступленні на сесіі Станіслаў Шушкевіч на спробы некаторых дэпутатаў унесці ў праект Канстытуцыі ўсе магчымыя сацыяльныя гарантыі і бясплатныя даброты. І сапраўды, у мяне асабіста часта з'яўлялася ўражанне, што частка дэпутатаў моцна блытае «божы дар» рыначных адносін з «яешняй» сацыялістычных нібыта гарантый.

Ну аніяк не вытравіць з нас (а дэпутаты ў пэўнай ступені з'яўляюцца адбіткам грамадства) невыкараняльнае жаданне калі не быць на самай справе, дык хоць бы называцца самымі перадавымі, дэмакратычнымі, гуманістычнымі! Здаецца, аніводная самая развітая дзяржава ў свеце не можа гарантаваць сваім грамадзянам права на жыллё, якасную (падкрэслю) бясплатную ахову здароўя, бясплатную вышэйшую адукацыю і потым працаўладкаванне па спецыяльнасці. Аніводная. Была такая дзяржава — СССР,— і ўсе мы цудоўна ведаем, у якім стане там была медыцына, колькі атрымлівалі ўрач і настаўнік і як вырашалася жыллёвае пытанне, калі двухпакаёвая кватэра атрымлівалася якраз да паўналецця дзяцей. Мала што ўсе гэтыя правы не выконваліся — галоўнае, яны былі запісаны ў «самай перадавой» савецкай Канстытуцыі.

І вось, слухаючы некаторых прамоўцаў на сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі, здавалася, што гэтыя людзі апантаныя жаданнем стварыць не закон, не юрыдычны дакумент, а напісаць раман аб нейкай утапічнай казачнай дзяржаве, дзе будзе ўсяго-ўсяго і для ўсіх-усіх. Слушна заўважыў дэпутат-юрыст, старшыня парламенцкай Камісіі па заканадаўству Дзмітрый Булахаў, сказаўшы, што такая колькасць дэкларуемых правоў у Канстытуцыі была б чарговым падманам народа і чарговай фікцыяй. Гэтыя правы калі і могуць існаваць у Асноўным законе, дык толькі як стратэгічныя мэты дзяржавы, а не як кіраўніцтва да дзеяння.

А другі юрыст, дэпутат Ганчар, заўважыў, што несумяшчальныя кампрамісы ў заканадаўстве надзвычай непажаданыя, паколькі ніколі не прывядуць да стварэння нармальнага юрыдычнага дакумента. І дадаў далей, што яго ахоплівае вельмі цяжкае пачуццё, бо ён не бачыць перспектыў прыняцця Канстытуцыі гэтым саставам Вярхоўнага Савета.

Падставы для такой заявы, безумоўна, былі, бо некаторыя выступленні з'яўляліся спробай вярнуцца назад, паставіць пад сумненне нават ужо прынятыя рашэнні. Дэпутаты нібыта забылі, што яшчэ ў лістападзе мінулага года ўхвалілі асноўныя палажэнні Канстытуцыі. А цяпер, напэўна, прадстаўнікі так званай «парламенцкай большасці» ўсвядомілі, што прыняцце Канстытуцыі — апошняя магчымасць даць бой па такіх пытаннях, як дзяржаўная мова, прыватная ўласнасць на зямлю, нейтралітэт дзяржавы. І бой быў дадзены.

Таму пад канец ранішняга пасяджэння абмеркаванне Канстытуцыі было больш падобна на палітычныя дэбаты — без канкрэтных вынікаў і рашэнняў.

Віталь ЦЫГАНКОЎ.

P. S. Галасаванне было адкладзена, бо не быў размножаны адзін з праектаў пастановы. Парламент пачаў абмяркоўваць пытанне аб рэферэндуме.

У ПРЭЗІДЫУМЕ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У Доме ўрада адбылося чарговае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Абмеркаваны праекты праграмы развіцця энергетыкі і энергазберажэння рэспублікі на перыяд да 2010 года, комплекснай праграмы дэманапалізацыі народнай гаспадаркі Беларусі на 1992—1993 гады, а таксама праекты законаў «Аб ахове працы» і «Аб судовым уладкаванні і статусе суддзяў у Рэспубліцы Беларусь».

З інфармацыяй па першым пытанні выступіў міністр энергетыкі Валянцін Герасімаў, які выклаў асноўныя напрамкі ў развіцці энергетычнай сістэмы рэспублікі, а таксама сфармуляваў канцэпцыю самастойнай палітыкі ў галіне вытворчасці і зберажэння энергарэсурсаў. Прэзідыум Савета Міністраў адобрыў праект праграмы і даручыў унесці неабходныя карэктывы ў яе змест, якія ўзнікалі ў ходзе абмеркавання.

Разгледжана таксама пытанне аб дэманапалізацыі народнай гаспадаркі Беларусі. У ходзе дыскусіі прызнана неабходным дапрацаваць прадстаўлены праект, а таксама правесці шырокае абмеркаванне найбольш спрэчных момантаў са спецыялістамі розных ведамстваў і арганізацый.

Абмеркаваны іншыя пытанні дзейнасці ўрада.

Вёў пасяджэнне Прэзідыума першы намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларусі Міхаіл Мясніковіч.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

КАНЦЛЕР ВЕДАЎ БЫ — ПАДЗЯКАВАЎ

У Мінскім вышэйшым ваенным інжынерным вучылішчы адбылася прэзентацыя кнігі гісторыка-даследчыка Г. Сагановіча «Айчыну сваю баронячы», прысвечанай славутаму беларускаму ваяру К. Астрожскаму (1460—1510)—найвышэйшаму канцлеру Вялікага княства Літоўскага. Спонсарамі мерапрыемства выступілі прыватныя фірмы «КАМВАР» (дырэктар В. Радчанка) і «КАНКОР» (дырэктар У. Бабіцкі), на сродкі якіх таксама было набыта і распаўсюджана сярод курсантаў шмат экземпляраў гэтай кнігі.

Падпалкоўнік А. КУЛЕШ.

ДЫПЛАМАТЫЧНЫ СКАНДАЛ

НЯМА МІРУ ПАД АЛІВАМІ...

ХТО АДВУЧЫЦЬ НАС АД ПРЫВЫЧКІ СТВАРАЦЬ САБЕ ДАДАТКОВЫЯ ЦЯЖКАСЦІ, А ПОТЫМ ПЕРААДОЛЬВАЦЬ ІХ?

Хочаш мець ворага — пазыч каму-небудзь грошай. Гэтая паўзабытая прымаўка ўспомнілася зусім не таму, што хочацца лішні раз праілюстраваць «высокасвядомы» ўзровень нашых бытавых адносін, калі добрая справа ператвараецца ў сваю процілегласць. Куды горш, калі шчырае жаданне аднаго народа дапамагчы ў бядзе другому можа гэтыя самыя народы... пасварыць.

Менавіта такую недарэчную сітуацыю мы якраз і маем сёння: урад Італіі пры актыўным садзейнічанні пасла гэтай краіны ў Беларусі сеньёра Бертынета вельмі аператыўна адгукнуўся на нашу просьбу і паставіў для задавальнення патрэб насельніцтва, пацярпеўшага ад чарнобыльскай катастрофы, буйную партыю выдатнага аліўкавага алею — больш як 800 тон. А ў Гомелі напалоханыя чуткамі спажыўцы неўзабаве пачалі вяртаць куплены алей у магазіны — маўляў, прадукт нейкі падазроны, нізкай якасці.

Скандал? Яшчэ які! На жаль, да «раскручвання падзей» «прыклала руку» і наша журналісцкае пяро.

У мінулы чацвер па праграме «Радыёфакт» прагучала паведамленне, сэнс якога быў прыкладна такі: у Гомелі па скаргах пакупнікоў прыпынены продаж італьянскага аліўкавага алею. На думку спецыялістаў абласной санітарна-эпідэміялагічнай станцыі, гэты прадукт патрабаванням еўрапейскіх стандартаў не адпавядае. У нечым падобная інфармацыя прайшла і па абласным радыё.

Вынік — вядомы: масавыя звароты ў магазіны, да кіраўніцтва мясцовага гандлю, у газеты і г. д. А яшчэ — тлустая пляма на тканіне ўзаемаадносін паміж дзвюма дзяржавамі, што так добра і дынамічна пачалі развівацца. Гэтая прыкрая сітуацыя, вельмі непрыемная для нашай грамадскасці і беларускага ўрада, і паслужыла падставай для прэс-канферэнцыі, якую наладзілі пазаўчора намеснік Старшыні Саўміна рэспублікі, старшыня Дзяржкамчарнобыля І. Кенік і міністр аховы здароўя В. Казакоў.

Але дзе пачатак усяго гэтага ланцужка недарэчнасцей, які вельмі нагадвае славуты «сапсаваны тэлефон»? Ёсць жа недзе крыніца фактаў і «факцікаў», якая сілкавала сродкі масавай інфармацыі? І хоць многае адпаведнымі органамі яшчэ высвятляецца, шлях нараджэння славутай «дэзы», на нашу думку, быў прыкладна наступным.

ЯКАСЦЬ ТАВАРУ, высокая рэпутацыя сваёй маркі для салідных заходніх фірмаў—справа не толькі гонару, але і ўласнага выжывання. Таму вядомыя ўсяму свету вытворцы харчовых тавараў сваю прадукцыю пастаўляюць спажыўцам іншы раз нават без адпаведных сертыфікатаў якасці. І гэта ўвогуле не дзіўна, паколькі ім давяраюць. Іменна такія фірмы, якія выйгралі спецыяльны конкурс на пастаўкі ў Беларусь, абвешчаны італьянскім урадам, і адправілі нам аліўкавы алей. Перад адпраўкай, дарэчы, прадукт прайшоў самы жорсткі кантроль на адпаведнасць медыка-біялагічным і іншым нормам.

Тым не менш, ніхто не вызваляў нашы службы ад паўторнай, ужо ўласнай, праверкі пастаўляемых з-за мяжы харчовых тавараў з мэтай выдачы айчынных сертыфікатаў. Зрабілі гэта своечасова ў Гомелі? Не! Запатрабавалі неабходныя дакументы кіраўнікі мясцовага гандлю? Таксама не! І ў парушэнне ўсіх інструкцый хуценька адкрылі гандаль замежным таварам. Вельмі падазроная паспешлівасць...

Прызнаемся, мы, як і многія нашы нязмучаныя далікатэсамі спажыўцы, упершыню ўбачылі гэтыя акуратныя бляшаныя цыліндрыкі з алеем, з надпісам, зробленым па-беларуску (сеньёр Бертынета заўважыў: каб ценявыя структуры не змаглі спекуляваць). Убачылі прыемны жоўта-зялёны колер, удыхнулі тонкі водар каштоўнага лекавымі ўласцівасцямі алею. Так, гэта сапраўды у нечым медыцынскі прадукт, які стагоддзямі служыў чалавеку лякарствам. Цяпер яго адпраўляюць у нашы дзіцячыя сады, бальніцы і шпіталі.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Сустрэча Ягора Гайдара з Вячаславам Кебічам

МАСКВА, 27. (Кар. ІТАР—ТАСС Сяргей Пад'япольскі). Як станоўчыя ахарактарызаваў Старшыня Савета Міністраў Беларусі Вячаслаў Кебіч вынікі праведзеных сёння перагавораў з выконваючым абавязкі кіраўніка ўрада Расіі Ягорам Гайдарам. У гутарцы з журналістамі ён паведаміў, што на сустрэчы былі абмеркаваны і прынцыпова ўзгоднены пытанні запазычанасці расійскіх прадпрыемстваў прадпрыемствам Беларусі, а таксама пытанні паставкі расійскай нафты рэспубліцы.

Вячаслаў Кебіч паведаміў таксама, што Беларусі прадастаўлена права на пропуск расійскай нафты праз яе тэрыторыю. Рэспубліка сама будзе весці перагаворы з рэгіёнамі Расіі аб механізме прагону і паставак нафты.

Прэм'ер Беларусі, які атрымаў гэтымі днямі ад парламента станоўчую ацэнку яго дзейнасці, пажадаў Ягору Гайдару «выстаяць гэтак жа мужна, як ён стаіць да гэтага часу».

Сёння вечарам Вячаслава Кебіча прыме Прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Аб зацвярджэнні Часовага палажэння аб парадку правядзення чарговага прызыву на тэрміновую ваенную службу ва Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь і іншыя воінскія фарміраванні

У адпаведнасці з пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 14 кастрычніка 1992 г. «Аб парадку прызыву грамадзян Рэспублікі Беларусь на тэрміновую ваенную службу ў 1992 годзе» Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

зацвердзіць прыкладаемае Часовае палажэнне аб парадку правядзення чарговага прызыву на тэрміновую ваенную службу ва Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь і іншыя воінскія фарміраванні.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. КЕБІЧ.

Кіраўнік спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. КАЎКО.

23 кастрычніка 1992 г.
г. Мінск.

РАДЫЁФАКТ

Французская спецыялізаваная кампанія «Кампенон-бернар» падрыхтавала праект па абясшкоджванню Чарнобыльскага комплексу. Ідэя распрацаванага праекта — назаўсёды захаваць у магутную «грабніцу» нейдзейны саркафаг, якім у 1986 годзе быў закрыты аварыйны рэактар.

«Калі-небудзь настане час, і на тым месцы, дзе зараз знаходзіцца 4-ты рэактар АЭС у Чарнобылі, будзе зялёны лужок»,— такі аптымістычны пункт гледжання аўтара праекта Жана-Луі Ле Мао.

***

У Віцебску курс долара падскочыў да фантастычнага ўзроўню. На мінулым тыдні за адзін долар тут давалі 417 рублёў, за нямецкую марку 277 мінус камісійныя.

«НАСТАЎНІКУ ТАК ДОЎГА ГАВАРЫЛІ: ТРЭБА ПАЦЯРПЕЦЬ...»

Як паведамлялася ўжо, пастанова аб павышэнні заработнай платы з 1 верасня ў 1,5 раза не задаволіла педагагічных работнікаў. Сацыяльная напружанасць у навучальных установах рэспублікі нарастае з кожным днём.

Пракаменціраваць сітуацыю мы папрасілі старшыню Савета па каардынацыі забастовачнага руху ў педагагічных калектывах Беларусі Тамару Іосіфаўну Чобатаву.

— Як вядома, 23 красавіка сесія Вярхоўнага Савета па настойліваму патрабаванню педагагічнай грамадскасці прыняла папраўку да пастановы аб тэрмінах увядзення пункта 7 артыкула 34 Закона «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», у адпаведнасці з якой гарантавалася ўстанаўленне з 1 верасня гэтага года стаўкі заработнай платы педагагічных работнікаў не ніжэй за сярэднюю заработную плату служачых у прамысловасці, а прафесарска-выкладчыцкага саставу — у 1,5 раза вышэй гэтага ўзроўню. Аднак урад рэспублікі не выканаў пастанову Вярхоўнага Савета. Павелічэнне ставак заработнай платы педагогаў у 1,5 раза не забяспечыла выканання Закона. Мяркуйце самі: сярэдняя зарплата служачых у прамысловасці за верасень склала 7.013 рублёў, а стаўка педагога — 3.640. Нават пасля пераразліку (з каэфіцыентам 1,5) зарплата педработнікаў складае толькі 77,9 працэнта ад сярэдняй у прамысловасці. Як бачым, Закон аб адукацыі па-ранейшаму не выконваецца. Таму ў настаўнікаў ёсць усе падставы сказаць, што іх падманулі.

Настаўніку так доўга гаварылі: трэба пацярпець... Але ж усякаму цярпенню прыходзіць канец. Мы згодны, забастоўка — не самы лепшы сродак для вырашэння праблемы, але іншага выйсця проста не бачым.

— Нават разумеючы аб'ектыўнасць усіх патрабаванняў, усё ж страшна ўявіць, што настаўнік пойдзе на гэтую крайнюю меру...

— Забастоўка — сапраўды, крайняя мера, і мы спадзяёмся, што пытанне вырашыцца станоўча, да забастоўкі справа не дойдзе. Нельга ж не ўсведамляць: жыццёвы ўзровень настаўніка катастрафічна зніжаецца. Напрыклад, зараз ідзе падпіска на газеты і часопісы — вы паспрабуйце правесці апытанне, што змаглі выпісаць настаўнікі. Мізэр. І хто асмеліцца кінуць у іх камень?..

Жыццёвы ўзровень зніжаецца, інфляцыя прагрэсіруе амаль штодня, а даплата за педагагічную нагрузку засталася ранейшай — гэта значыць, практычна ператварылася ў нішто. Так, настаўнік пачатковых класаў за праверку сшыткаў атрымлівае 112 рублёў 50 капеек. Давайце лічыць: у сярэднім яму трэба праверыць 1.320 сшыткаў у месяц. Толькі каб адкрыць-закрыць сшытак, патрэбны 2 хвіліны (дзвюх хвілін на праверку, вядома ж, не хапае). Нават пры такой самай сціплай раскладцы на праверку сшыткаў настаўніку неабходна 44 гадзіны ў месяц. Каб атрымаць 10 рублёў на бохан хлеба, ён павінен за 4 гадзіны праверыць 260 сшыткаў.

— Лічбы гэтыя здаюцца проста неверагоднымі.

— Ну ёсць жа каламбурнага плана выраз: відавочнае—неверагоднае. Вельмі падыходзіць да сітуацыі, у якой мы апынуліся сёння.

Сорамна гаварыць, але народны настаўнік (а іх у Беларусі толькі пяць) атрымлівае даплату 100 рублёў у месяц, Заслужаны настаўнік (іх у нас амаль 30 чалавек) — 60 рублёў. Калі раней гэта складала 10—12 працэнтаў ад асноўнай стаўкі, то зараз — усяго 2—3 працэнты. Хіба гэта нармальна — да такой ступені ўніфікаваць працу настаўніка?

Ёсць дасціпнае слова — «урокадавальнік». Такое ўражанне, што настаўнікаў хочуць ператварыць менавіта ва ўрокадавальнікаў. Тады пра якую творчую лабараторыю педагога можна гаварыць? Пра якое выхаванне?.. Здаецца, аналізуючы нядаўнюю мінуўшчыну, мы прыйшлі да высновы, што адна з галоўных памылак — у недаацэнцы ролі настаўніка ў выхаванні асобы. І зноў, ужо на новай стадыі, паўтараем яе... Неабходна даць магчымасць настаўніку выйсці са стану прыніжанасці. Хіба зможа настаўнік-жабрак узвысіцца над будзённасцю?..

— Тамара Іосіфаўна, вы з'яўляецеся старшынёй Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Беларусі. Якую пазіцыю займае гэтая арганізацыя?

— Рэспубліканскі камітэт прафсаюзаў падтрымаў патрабаванні настаўнікаў і шмат зрабіў для таго, каб давесці іх да ўрада ў максімальна аргументаваным, доказным выглядзе. Мы ўважліва і грунтоўна вывучылі гісторыю пытання (ажно з 1945 года), склалі падрабязныя табліцы з усімі раскладкамі.

29 кастрычніка адбудзецца пленум Рэспубліканскага камітэта прафсаюзаў, дзе будуць сфармуляваны ўсе нашы патрабаванні, намечаны шляхі далейшых дзеянняў. Падкрэслю яшчэ раз: мы хочам дабівацца вырашэння ўзнікшай праблемы цывілізаванымі шляхамі: спачатку на ўзроўні пагаджальнай камісіі, арбітражу. Калі сесія ВС не вырашыць пытання станоўча, то, захоўваючы тэрміны падрыхтоўкі да забастоўкі, 20 снежня будзем гатовы да яе правядзення.

А пакуль што мы падалі заяўку ў Мінгарвыканком на правядзенне 5 лістапада маршу маўчання. Хочам прайсці ад Кастрычніцкай плошчы да плошчы Незалежнасці з лозунгамі і транспарантамі, на некалькі хвілін спыніцца каля Дома ўрада...

— Даволі нечаканая форма пратэсту ў наш крыклівы час.

— Мы ўжо сказалі ўсё. Дый па натуры сваёй настаўнік — чалавек інтэлігентны. Між іншым, многія і не вераць, што ён здольны на забастоўку: прывыклі бачыць настаўніка запалоханым, заўсёды гатовым ісці на ланцугу сістэмы. Аднак настаўнік апынуўся ля апошняй рысы...

— Асобныя настаўніцкія калектывы пачалі ўжо забастоўку?

— На жаль. Гэтыя крокі заўчасныя, яны не на карысць, бо поспех любой справы залежыць ад паслядоўнасці, кампетэнтнасці, адзінства дзеянняў. І я, карыстаючыся магчымасцю, хачу праз вашу газету яшчэ раз звярнуцца да калег з просьбай устрымацца ад калектыўных дзеянняў забастовачнага характару. Будзем спрабаваць вырашыць праблему цывілізаванымі шляхамі.

Гутарыла Таццяна ПАДАЛЯК.

ПОДЗВІГ СКАРЫНЫ

Выступленне міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь П. КРАЎЧАНКІ на адкрыцці мемарыяльнай дошкі ў гонар Францішка Скарыны ў Падуанскім універсітэце 20 кастрычніка 1992 г.

Шаноўная грамада!

Паважаныя спадарыні і спадары!

Беларусы, як і ўсе народы свету, маюць сваіх выдатных сыноў. Фізічна адыходзячы ад нас у вечнасць, яны духоўна застаюцца з намі, сваім існаваннем, прыкладам жыцця, геніяльным яго прадбачаннем яднаюць жывую повязь пакаленняў, вечнасць і неўміручасць нацыянальнага духу, неўміручасць народа. І ў гэтым — існасць жыцця. Яны — духоўныя правадыры і павадыры нацыі, яе гонар і сумленне, шчасце і радасць, надзея і неўтаймоўны боль яе. Пакуль будзе існаваць жыццё на зямлі, датуль сэрца кожнага беларуса будзе саграваць вечнае сонейка, імя якому — Францішак Скарына.

Хто ён і што было зроблена ім дзеля таго, каб назаўсёды застацца ў памяці народнай?

Сёння, у гэты ўрачысты час мы з гонарам гаворым пра подзвіг Скарыны і са смуткам — пра яго трагедыю.

Проста немагчыма ўявіць і паверыць у тое, што ўсё, зробленае ім, створана адным чалавекам. Можна дзякаваць лёсу, што ў Сярэднявеччы не звязалі гэта з д'ябальскім уплывам і нечалавечай апантанасцю.

Але гэта быў сапраўдны подзвіг у імя нацыі, першы подзвіг на цярністым шляху нацыянальнага Адраджэння і ў той жа час першы прыклад нацыянальнага месіянства. Ён прыйшоў да свайго знясіленага народа, бо так было трэба. Прыйшоў час яго і час яго народа.

Гэта быў подзвіг, бо ён даў народу СЛОВА, роднае СЛОВА, дарагое для кожнага з нас СЛОВА. Як тут не ўспомніць Біблію: «І першым было слова!» Яго пераклад Святога Пісання на беларускую мову — першы сярод усходнеславянскіх народаў і другі, пасля чэшскага, сярод сусветнага славянства. На небасхіле нашай нацыянальнай гісторыі золатам зіхаціць 6 жніўня 1517 года, калі у Празе-Чэшскай Скарына выдаў першую кнігу на старабеларускай мове «Псалтыр», а ўвогуле менш чым за два гады «пусціў у свет» 22 кнігі Святога Пісання.

Гэта быў подзвіг, бо ён заклаў падмурак нашага гуманізму і талерантнасці, нашай павагі да іншых, значна большай, чым да саміх сябе. Прычым у той час, калі ў Еўропе вера ператварылася ў фанатызм, у сваю знішчальную працілегласць і змрочныя сполахі вогнішчаў аўта-дафэ наводзілі жах на кволых духам і целам.

Гэта быў подзвіг, бо, як у чароўнай казцы, дзвюма-трыма кнігамі ЁН адчыніў дзверы і з цемры вывеў людзей на святло, увёў нас у агульналюдскую, агульнаеўрапейскую сям'ю, у пантэон гуманістычнай культуры нашага кантынента, заявіў аб праве беларускага народа на нацыянальна-культурнае вызначэнне.

Мы — еўрапейцы-аўтахтоны — і спрадвеку жылі на сваёй зямлі, але паводзілі сябе даволі стрымана, нясмела азіраліся навокал, а тут адразу, адным махам, увайшлі ў агульнаеўрапейскі культурны працэс.

Гэта быў подзвіг, бо Скарына даў народу веды ў сямі навуках «вызваленых», такіх, як граматыка, логіка, рыторыка, фізіка, арыфметыка і геаметрыя, музыка, астраномія.

Гэта быў подзвіг, бо ён першы сярод беларусаў выступіў супраць братазабойства, за тое, каб нацыя, якую раздзіралі на рэлігійныя канфесіі, адчула сябе хоць на нейкі час адным жывым нацыянальным целам, адчула сябе адзіным народам, які потым ворагі на працягу нашай шматпакутнай гісторыі яшчэ не раз «жыўцом ірвалі на кускі» (Я. Купала).

Такім чынам, веліч Скарыны, галоўны сэнс яго дзейнасці заключаецца ў тым, што, даўшы народу роднае слова ў звыклай для яго форме, стварыўшы сумесна з М. Гусоўскім падмурак нацыянальнай літаратуры эпохі Рэнесансу, даўшы «людзям паспалітым» самыя разнастайныя веды, ЁН па сутнасці ўдыхнуў у знясіленыя душы веру ў НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ, зрабіў усё, каб людзі нашы адчулі сябе НАРОДАМ, БЕЛАРУСАМІ.

У жыцці кожнага народа ідуць заўсёды поруч чорнае і белае, светлае і радаснае, змрочнае і трагічнае. Так і ў жыцці чалавека, тым больш такога незвычайнага, як Скарына.

Яшчэ і яшчэ раз варта падкрэсліць трагічнасць Скарыны, нявысветленасць і таямнічасць многіх старонак яго жыцця, супярэчлівасць яго жыццёвага шляху і лёсу. Муза гісторыі — Кліо — здаецца, зрабіла ўсё, каб максімальна ўскладніць вывучэнне жыцця і творчасці Скарыны.

Мы і сёння дакладна не ведаем, калі нарадзіўся наш вялікі гуманіст, хоць большасць даследчыкаў схіляюцца да таго, што гэта шчаслівая падзея прыпадае на 6 сакавіка 1486 года ці на 1490 год і адбылася ў беларускім горадзе Полацку. Мы і сёння, падчас больш чым 100-гадовага існавання навуковага скарыназнаўства, не ведаем дакладна яго канфесіянальнай прыналежнасці. Нарадзіўшыся ў праваслаўнай купецкай сям'і, атрымаўшы пачатковую адукацыю ў полацкіх манахаў-бернардзінцаў, носячы каталіцкае імя Францішак, у той жа час ён друкаваў свае кнігі кірыліцай, неаднаразова падкрэсліваючы, што робіць гэта для праваслаўнага люду.

Думаецца, зусім не выпадкова галоўную справу свайго жыцця — друкаванне першай беларускай кнігі — ён пачаў у праваслаўнае свята ПЕРАСТВАРЭННЯ, якое заўсёды асацыіравалася з АБНАЎЛЕННЕМ. І тут мы маем першы і незвычайна важны прыклад беларускасці. Калі ідэалогія, вера, няхай самыя лепшыя, дзеляць, ірвуць нацыю на часткі, яны павінны быць рашуча адсунуты ўбок і на першае месца павінны выйсці кроўная еднасць, яскравае ўсведамленне таго, што перш за ўсё мы — беларусы, браты па крыві, адзіны народ, а потым — усё астатняе. Думаю, што і ў сённяшніх абставінах самаахвярны прыклад жыцця Скарыны, яго запаветы гучаць вельмі актуальна ў палітычных варунках. Давайце ў гэты светлы час успомнім пра іх і назаўсёды гэта запомнім.

Белае і чорнае... Подзвіг, трыумф і трагедыя. Не многа знойдзецца людзей, якім быў наканаваны такі нялітасцівы і жорсткі лёс. Нястачы, практычна беднасць, вечныя вандроўкі па ўсёй Еўропе, смерць бацькоў, арышт брата ў Познані, заўчасная смерць жонкі Маргарыты, трагічная смерць малодшага і горача любімага сыночка Францішка, які загінуў, як сведчаць архіўныя дакументы, 2 чэрвеня 1541 года ў час пажару ў Празе ў доме сябра святога Віта, каноніка Вышаградскага Яна з Пухава — ці не замнога гэта для аднаго чалавека? А калі дадаць да гэтага шмат складанасцей, звязаных з лёсам яго кніг, з іх знішчэннем цемрашальным духавенствам у Маскве, складанасцямі віленскага перыяду жыцця нашага першадрукара і асветніка, то ўзнікае пытанне: як усё гэта можна было вытрымаць?

Такім чынам, паўстае не толькі трагедыя асобы, але і трагедыя нацыі, якая так і не ведае, дзе, як і калі адышоў у вечнасць, у неўміручасць Францішак Скарына, гістарычная постаць якога не мае сабе роўных.

Вось чаму для кожнага свядомага беларуса «старыя камяні Еўропы» — Полацка і Вільні, Кракава і Падуі, Прагі і Капенгагена, Кёнігсберга і Вітэнберга (там ён, відаць, сустракаўся з Марцінам Лютэрам) — святыня ў поўным сэнсе гэтага слова, своеасаблівая «духоўная Мека», ім хоць раз у жыцці трэба абавязкова пакланіцца. Так, для нас з'яўляецца святой зямля братняй Чэхіі, дзе спачывае прах Францішка Скарыны. Для нас з'яўляецца святым і ўсё тое, што звязана ў Падуі з імем беларускага першадрукара і асветніка. Вось чаму з такім хваляваннем і радасцю мы сёння знаходзімся тут, у сусветна вядомым Падуанскім універсітэце, дзе некалі ступала нага Скарыны, моцна гучаў яго малады голас, адбылася ўрачыстасць атрымання ганаровага звання доктара медыцыны.

Што ўяўляў сабою Падуанскі універсітэт у XV—XVI стагоддзях? Нам уяўляецца, што ў гэты час ён далёка апярэджваў іншыя італьянскія універсітэты, не выключаючы і знакамітай Балонні, і зрабіўся сапраўдным «сусветным светачам», адным з найбольш важкіх міжнародных і культурных асяродкаў. У той жа час Падуанскі універсітэт быў тыповым італьянскім універсітэтам, які прынцыпова адрозніваўся ад іншых заходнееўрапейскіх навучальных устаноў, у першую чаргу ад Сарбоны.

У Парыжы — багаслоўе, прафесарскае кіраўніцтва, напалову «кляштарнае жыццё ў бурсах», непарушнасць аўтарытэтаў; у італьянскіх універсітэтах, перш за ўсё ў Падуі і Балонні, — вывучэнне права, студэнцкае кіраўніцтва, жыццё на вольных кватэрах, свабода ў вывучэнні і выкладанні. Глыбокая розніца абодвух тыпаў, урэшце, выявілася ў адносінах да чужакоў і чужаземцаў. Толькі італьянскія універсітэты прымалі іх, пры гэтым з самага пачатку — на аднолькавых правах. Найбольш «італьянскім» універсітэтам быў Падуанскі, чым і тлумачацца хуткія і няўхільныя яго поспехі.

Другая, не менш важная прычына — сувязь яго з Венецыяй, хутчэй за ўсё залежнасць ад яе. Пасля доўгай і ўпартай барацьбы Венецыя ўсё ж здолела заўладаць «Сухазем'ем». Для Венецыі альтэрнатывы не было: «Сухазем'е» — гэта не столькі пытанне ўлады, колькі хлеба і транспартных камунікацый.

Гэтыя падзеі далі магчымасць атрымаць з Венецыі значныя фінансавыя асігнаванні. Гуманіст Мазагая праз дзесяць гадоў пасля далучэння Падуі да Венецыі прыходзіць у захапленне ад тых «нечуваных шчодрасцей», якія пасыпаліся на Падуанскі універсітэт. Ён атрымаў стары палац падуанскіх герцагаў Карар, які скінула Венецыя, а ў 1468 годзе — статут «дзяржаўнага». Усё гэта дало магчымасць яму хутка ператварыцца ў прызнаны цэнтр гуманізму, рэнесансу, талерантнасці. У 1497 годзе тут была заснавана кафедра па вывучэнню твораў Арыстоцеля. Выкладаецца грэцкая, яўрэйская і арабская мовы. Пашыраецца і ўмацоўваецца авераізм, прыхільнікам якога быў і Скарына. Сюды, у Падую, накіроўваюцца сотні студэнтаў практычна з усіх краін, і больш за ўсё з Германіі (па некаторых даных — да 59 працэнтаў ад колькасці іншаземных студэнтаў). Ідэі і творы М. Лютэра пранікаюць сюды так моцна, што ў данясенні ў Ватыкан ад 26 лістапада 1521 года падкрэсліваецца наступнае: «Зараза гэтая настолькі пашырылася ў Падуі, што няма ніводнага адукаванага чалавека, які б не быў лютэранцам». Не выпадкова пасля паражэння вялікага сялянскага паўстання 1525 года адзін з яго правадыроў, Міхайла Гэйсмайер, быў вымушаны ўцякаць з Зальцбурга, але спакойна жыў у Падуі.

Прыцягальнымі для еўрапейскай моладзі былі славутыя постаці універсітэцкіх выкладчыкаў. Імі былі падуанскія светачы — Піліпа Дэчыо, Сачыні, Франчэска Курсіо, Антоніо Росі, Марка Мантуа Бэнавідэс, Тыбэрыо Дэчыяна, Джавані Чэфале, Франчэска Мантыка, Джакома Мэнокіо, Гвіда Панчыроле. Не будзем забываць, што амаль два дзесяцігоддзі ў якасці прафесара матэматыкі тут выкладаў Галілей. Прафесар Джыраляма д'Аквапандэнтэ практычна закончыў распрацоўку тэорыі цыркуляцыі крыві, якую потым дапрацаваў (але не «адкрыў», як гэта часта сцвярджаецца) англійскі навуковец Гервей.

Варта, урэшце, прыгадаць некалькі імёнаў славутых выхаванцаў Падуі — Піка дэла Мірандоля, Франчэска Гвічыярдзіні, Пандольфа Каленчыё, Гвіда Панчыроле (ён жа потым і прафесар), П'етра Бэмба, Джавані Навіцыяна, папаў і кардыналаў (Аляксандр VIII, Франчэска дэла Роверэ — ён жа Папа Рымскі, Сіксцін IV, Сарпі), каралёў (Ян Сабескі, Густаў Шведскі, Стэфан Баторый), паэтаў і драматургаў (Ян Каханоўскі, Піліп Сідней, Тарквата Таса, Лёдавіка Арыёста). З Падуанскім універсітэтам звязаны асобы Тамаза Кампанелы, Эразма Ратэрдамскага, Мікалая Каперніка і іншых, што праславілі эпоху Адраджэння. Асаблівай увагі заслугоўвае прадстаўніца прыгожай палавіны чалавецтва Алена Лукрэцыя Карнара Піскапія, якая ў 1678 годзе атрымала ў Падуанскім універсітэце ступень доктара філасофіі і такім чынам была першай жанчынай, якая атрымала універсітэцкую адукацыю. Варта назваць і Пятра Поснікава, выхадца з Расіі, які першым з рускіх атрымаў ступень доктара медыцыны (1694 г.).

Такія славутыя імёны і традыцыі спараджалі і новыя кнігі. Мы глыбока перакананы, што ў Падуанскім універсітэце добра ведалі выданні славутага венецыянскага друкара Альда Мануцыя, які зрабіў цэлую «рэвалюцыю» ў кнігадрукаванні, рашуча перайшоўшы на фармат, які быў найбольш зручным для людзей, зрабіў кнігу сапраўды даступнай. Не выпадкова Скарына выбраў для «Малой падарожнай кніжкі», выдадзенай у 1522 годзе ў Вільні, менавіта такі невялікі фармат. Прыгадаем, дарэчы, што Эразм Ратэрдамскі сказаў аб друкарскім знаку Альда Мануцыя (дэльфін, які абвіўся вакол якара, — сімвал рухомасці), што ён «мае большае значэнне, чым імператарскі герб на манетах».

Пасля ўсяго сказанага ці варта здзіўляцца, чаму менавіта ў Падую накіраваўся наш славуты зямляк. Упэўнены, што гэта было не выпадкова, гэта быў асэнсаваны выбар.

Як быў сустрэты ў Падуі беларускі юнак? Што адбылося тут у прыкладна такія ж кастрычніцкія дні 1512 года? Давайце дадзім слова сярэдневяковаму летапісцу, давайце паслухаем яго:

«1512 (год), індыкта XV. У аўторак, 9 лістапада месяца. Асобы экзамен у галіне медыцыны знакамітага мужа пана магістра Францыска, сына нябожчыка пана Лукі Скарыны з Полацка, русіна, сакратара караля Дацыі. У прысутнасці архіепіскапа яснавяльможнага пана Суфрагана і вікарыя славутая Калегія паноў (майстроў) мастацтваў Падуі пры ўдзеле дастойнага мастацтваў і медыцыны доктара пана магістра Францыска Фуманэлі, віцэ-рэктара універсітэта (майстроў) мастацтваў экзаменавала. Усе былі аднадушныя і згодныя, без ніводнага голасу супраць, каб годнасць (Скарыны) у галіне медыцыны прызнаць. Пад апекаю сваіх прамотараў дактароў мастацтваў і медыцыны паноў магістраў Барталамея Барызона, які ўручыў знакі (доктара медыцыны)». (Знакамі медыцынскай годнасці ў тыя часы звычайна былі: круглы берэт ці чатырохрогая шапачка, пярсцёнак, кніга «Афарызмы» Гіпакрата ці Біблія.)

Давайце ў гэты ўрачысты момант яшчэ раз успомнім добрым словам усіх тых прафесараў і настаўнікаў Ф. Скарыны, якія яго экзаменавалі, кіраўніцтва Падуанскага універсітэта і асабліва віцэ-прыёра тагачаснай Калегіі Тадэя Мусаці, які вызваліў беднага юнака ад непасільнай аплаты за экзамен. Адзначым, што ў той час гэта рабілася толькі для самых таленавітых і, па некаторых даных, не ахоплівала больш 5 працэнтаў студэнтаў.

Падсумоўваючы сказанае, хацелася б падкрэсліць унікальнасць таго часу, які выклікаў да жыцця такіх волатаў нацыянальнага духу, як Францішак Скарына. Унікальны час нараджаў унікальных людзей, галоўнымі рысамі якіх былі:

Самаахвярнасць, імкненне ўсяго сябе аддаць свайму народу; імкненне да

Кансалідацыі беларускай народнасці, чаму ў немалой ступені садзейнічаў пераклад Бібліі на «руський язык», гэта значыць на старабеларускую мову.

Яна перастала быць «Lingua vulgaris», а ўзвышалася, ставілася ўпоравень з такімі «свяшчэннымі» мовамі, як стараяўрэйская, грэчаская, лацінская;

Апантанасць у працы, незвычайная як па тагачасных, так і па сягонняшніх мерках. Цяжка ўявіць, як змог Ф. Скарына ў лічаныя месяцы падрыхтаваць да выдання тэксты некалькіх кніг і аздабленне (ілюстрацыі, застаўкі, буквіцы, двухколерны друк і г. д.). Не забудзем, што кожная з кніг Скарыны — шэдэўр еўрапейскага выдавецкага мастацтва;

Рэвалюцыйнасць Скарыны, яго дух першапраходніцтва і барацьбы. Трэба было мець грамадзянскую мужнасць, каб пераглядзець кананічныя падыходы, даць народу Біблію на зразумелай яму мове. У той час у Еўропе быў яшчэ моцны дух сярэдневякоўя. Прыгадаем, што ў 1526 годзе ў Англіі павесілі Цындаля, які хацеў выдаць на роднай мове Новы запавет;

Інтэлігентнасць Скарыны, яго велізарная духоўнасць і ўзнёсласць;

Нацыянальны характар яго дзейнасці, творчасці, жыцця. Няшмат знойдзецца людзей, якія так дакладна, трапна, аўтэнтычна адлюстравалі б у сваіх кнігах лепшыя якасці нашага народа — стрыманасць, працавітасць, ветлівасць і талерантнасць. Любоў Скарыны да свайго народа, да роднай мовы, аднак, нідзе не перарастала ў нацыянальны эгаізм ці эгацэнтрызм;

Асветніцтва Скарыны, яго імкненне падзяліцца з простымі людзьмі ўсім тым лепшым, што ёсць у свеце. І зноў мы павінны ўспомніць яго прадмовы да кніг, па сутнасці арыгінальныя філасофскія творы, скарбніцу мудрасці, якія ў той час былі своеасаблівымі энцыклапедыямі, даведнікамі, першакрыніцамі ведаў для простага селяніна ці мешчаніна.

Пра подзвіг Скарыны можна гаварыць бясконца. Прыемна, што ў сваёй працы, лёсавызначальнай для нашага народа, ён быў не адзін. Услед за ім ужо ўздымаюцца магутныя постаці асветнікаў і філосафаў, пісьменнікаў і перакладчыкаў Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Сімяона Полацкага, Янкі Купалы, Якуба Коласа.

Вельмі прыемна тут, у Італіі, успомніць і аддаць належнае сучасніку Скарыны нашаму выдатнаму паэту Міколу Гусоўскаму, які ў час свайго дыпламатычнага падарожжа ў Рым пазнаёміўся з самымі славутымі людзьмі той эпохі, у тым ліку з папам Львом X. Менавіта ён выказаў жаданне атрымаць у дар чучала нябачанага ніколі ў Італіі звера — зубра і апісанне палявання на яго. Так з'явілася на свет адна з лепшых паэм таго часу — «Песня пра зубра», напісаная на лаціне.

Падкрэслім, што, як і Скарына, М. Гусоўскі быў вельмі адукаваным чалавекам. Ёсць звесткі, што 1 сакавіка 1520 года ў Балонскім універсітэце ён атрымаў ступень доктара філасофіі.

Белае і чорнае... Подзвіг, трыумф і трагедыя. Як усё гэта характэрна для нашага шматпакутнага народа! Але, нягледзячы на жорсткія выпрабаванні, войны, нацыянальныя здзекі з боку суседніх народаў, знішчэнне, здаецца, ушчэнт нацыянальнай культуры, ён выстаяў і перамог. Выстаяў дзякуючы таму, што на нацыянальным небасхіле заўсёды зіхацела нязгасная зорка Скарыны.

Сусветная слава сёння не грэе Францішка Скарыну, але яна патрэбна яго народу. Цяпер, як ніколі, калі мы ствараем незалежную дзяржаву, дзяржаву ва ўлонні Новай Еўропы, нам патрэбна такое нацыянальнае духоўнае апірышча, як ідэі і запаветы Скарыны.

Я мару пра тое, што некалі здзейсніцца амаль немагчымае: мы знойдзем святы прах Францішка Скарыны. Знойдзем і з гонарам перанясём у Нацыянальны Пантэон, які павінна мець кожная цывілізаваная нацыя. Перанясём туды ўсіх тых, хто з'яўляецца гонарам і сумленнем нацыі. Перанясём, каб ніколі не забываць пра продкаў, пра свае карані, пра сваю чалавечую годнасць, пра тое, што мы мацнеем як НАРОД.

Калі ў людзей ёсць такая мэта, такая мара, упэўнены, што яна павінна рана ці позна здзейсніцца.

У заключэнне хачу шчыра падзякаваць усім тым, хто спрыяў арганізацыі гэтага мерапрыемства, прафесарам, выкладчыкам і студэнтам Падуанскага універсітэта.

Словы сардэчнай павагі хачу выказаць кіраўніцтву універсітэта, асабліва яго рэктару спадару Бансамб'янтэ.

Шчыры дзякуй за ўвагу!

РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

Слова айца Алексія зноў гучыць у храме

Наша газета паведамляла ўжо аб спробе забойства настаяцеля жодзінскага храма Святога Архангела Міхаіла айца Алексія Шынкевіча. Айцец Алексій, які праходзіць курс рэабілітацыйнага лячэння, нядаўна пабываў у Мінску, дзе ў адным з храмаў выступіў з невялікай пропаведдзю. Нягледзячы на свой стан здароўя, ён згадзіўся даць інтэрв'ю нашаму карэспандэнту.

— Паважаю вашу газету. За яе цэнтрызм. За пошукі мірнага выйсця з крызісу.

— Дзякуй, айцец Алексій. Але ж ваша грамадзянская пазіцыя таксама заслугоўвае павагі. Напрыклад, у адносінах да еднасці вернікаў на Беларусі.

— У сваім жыцці я кіруюся словам Божым. З пазіцыі святога Евангелля даю ацэнку ўсяму, што адбываецца навокал. Яшчэ зусім нядаўна не ўзнікала пытання мірнага суіснавання канфесій. Сёння ж сёй-той спрабуе яго выцягнуць на паверхню. Перш за ўсё кідаецца ў вочы спроба акаталічыць беларусаў. Вядомы выпадкі, калі дзяцей вывозяць на аздараўленне на Захад і там, без згоды бацькоў, імкнуцца хрысціць. Ёсць іншыя прыкметы актыўнай дзейнасці каталіцкай царквы. З пазіцыі пастара я разумею, што ідзе барацьба за прыход. Аднак баюся не змяншэння ўплыву праваслаўя (у пытаннях веры мы агульную мову знойдзем), а нацыянальнага процістаяння.

Што датычыцца дзялення па нацыянальнай прыкмеце, то асабіста я вітаю ўсе захады ўрада і Вярхоўнага Савета, скіраваныя на захаванне адзінства нашага народа, умацаванне і захаванне славянскай сям'і. Як і ў сям'і чалавечай, славяне раслі разам. Разам прайшлі іх дзяцінства, юнацтва. Пасталеўшы, мы разышліся, утварыўшы свае дзяржавы. І грэх вялікі, калі сёння будзем жадаць гора брату свайму, будзем лаяцца з ім, абражаць яго.

— Адыдзем ад палітыкі. Кажуць, што вы даравалі сваім катам, якія хацелі забіць вас?

— Так. Я зрабіў па запаветах Хрыстовых. Я дараваў. Праўда, свецкая ўлада ўзбудзіла крымінальную справу па сваёй ініцыятыве. Ідзе следства.

— І апошняе. Як вы сябе адчуваеце? Ці ёсць сілы працягваць служэнне Госпаду?

— Вы бачыце: я фізічна слабы яшчэ, але гэта не значыць, што зломлены духоўна. Гасподзь пакінуў мяне на гэтым свеце, і я яго волю выканаю да канца. Я нічога не баюся. Калі да мяне ў кватэру зноў пазвоняць—я зноў адчыню дзверы. Душа—ад Госпада, яе—не забіць.

Благаслаўляю вашу газету і яе чытачоў на добрыя богаўгодныя справы.

Гутарыў Віктар ХУРСІК.

ЧАСОВАЕ ПАЛАЖЭННЕ

АБ ПАРАДКУ ПРАВЯДЗЕННЯ ЧАРГОВАГА ПРЫЗЫВУ НА ТЭРМІНОВУЮ ВАЕННУЮ СЛУЖБУ ВА ЎЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І ІНШЫЯ ВОІНСКІЯ ФАРМІРАВАННІ

1. Прызыўны ўзрост. Прызыў грамадзян на тэрміновую ваенную службу

На тэрміновую ваенную службу ў мірны час прызываюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 18 да 27 гадоў.

Прызыў грамадзян на тэрміновую ваенную службу праводзіцца на падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь два разы ў год, у красавіку-чэрвені і кастрычніку-снежні. Пастанова аб'яўляецца сродкамі масавай інфармацыі.

Пасля аб'яўлення пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь кожны прызыўнік у месячны тэрмін абавязаны з'явіцца ў ваенны камісарыят для прызыву на тэрміновую ваенную службу.

Кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, незалежна ад форм уласнасці і ўмоў гаспадарання, абавязаны вызваліць прызыўнікоў ад работы на час, неабходны для правядзення прызыву, адклікаць іх з камандзіровак і забяспечыць своечасовае прыбыццё на прызыўны пункт.

Уважлівымі прычынамі няўкі на прызыўныя пункты прызнаюцца:

хвароба грамадзяніна, якая пазбавіла яго магчымасці асабістай яўкі на прызыўны пункт;

смерць або цяжкая хвароба блізкага сваяка, якая патрабуе догляду з боку прызыўніка;

перашкода стыхійнага характару або іншыя незалежныя ад грамадзяніна акалічнасці, якія пазбавілі яго магчымасці асабіста з'явіцца ў ваенны камісарыят.

Прычыны няўкі павінны быць пацверджаны дакументамі адпаведных кампетэнтных органаў.

Прызыву на тэрміновую ваенную службу не падлягаюць грамадзяне:

прызнаныя па стану здароўя непрыгоднымі да ваеннай службы ў мірны час;

адбываючыя крымінальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі або папраўчых работ,— да адбыцця пакарання;

адбыўшыя пакаранне за ўчыненне цяжкага злачынства ў папраўча-працоўных установах;

умоўна-датэрмінова вызваленыя ад назначанага судом пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі або папраўчых работ,— на працягу неадбытай часткі пакарання;

у адносінах да якіх судом прыменены прымусовыя меры медыцынскага характару,— на працягу тэрміну дзеяння гэтых мер;

у адносінах да якіх вядзецца дазнанне або следства ці крымінальная справа разглядаецца судом,— да вырашэння іх справы органамі ўнутраных спраў, пракуратуры або судом.

2. Адтэрміноўка ад прызыву на тэрміновую ваенную службу

Адтэрміноўка ад прызыву на тэрміновую ваенную службу прадастаўляецца:

па сямейнаму становішчу;

па стану здароўя;

для прадаўжэння адукацыі;

для атрымання ваенна-тэхнічных спецыяльнасцей;

у сувязі з дэпутацкай дзейнасцю.

Адтэрміноўка ад прызыву на тэрміновую ваенную службу па сямейнаму становішчу прадастаўляецца асобам, якія маюць:

непрацаздольных бацьку і маці або адзінокіх непрацаздольных бацьку і маці*;

жонку, якая знаходзіцца ў водпуску па цяжарнасці і родах;

адно дзіця ва ўзросце да 3 гадоў, двух або больш дзяцей або жонку-інваліда I або II групы;

адзінокую працаздольную маці (бацьку), якая мае двух або больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў і не мае іншых працаздольных дзяцей;

аднаго або больш родных братоў і сясцёр ва ўзросце да 16 гадоў або старэй за 16 гадоў, пры ўмове, калі яны з'яўляюцца навучэнцамі агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, прафесіянальна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў або інвалідамі I або II групы, пры адсутнасці іншых асоб, якія маглі б узяць іх на ўтрыманне.

Адтэрміноўка ад прызыву на тэрміновую ваенную службу па сямейнаму становішчу прадастаўляецца прызыўнікам да 27-гадовага ўзросту. Калі гэтыя асобы да 27-гадовага ўзросту не страцяць права на адтэрміноўку, то ў мірны час яны вызваляюцца ад тэрміновай ваеннай службы і залічваюцца ў запас.

Асобы, прызнаныя часова непрыгоднымі да ваеннай службы ў мірны час, перыядычна праходзяць медыцынскі агляд ваенна-ўрачэбнымі камісіямі пры ваенных камісарыятах да дасягнення імі 27-гадовага ўзросту і ў выпадку прызнання іх прыгоднымі да ваеннай службы прызываюцца на тэрміновую ваенную службу на агульных падставах. Асобы, прызнаныя непрыгоднымі да ваеннай службы ў мірны час і абмежавана прыгоднымі ў ваенны час, залічваюцца ў запас, а непрыгоднымі да ваеннай службы з выключэннем з воінскага ўчоту — выключаюцца з воінскага ўчоту.

Адтэрміноўка ад прызыву на тэрміновую ваенную службу для прадаўжэння адукацыі прадастаўляецца:

студэнтам дзённых аддзяленняў вышэйшых навучальных устаноў;

студэнтам вячэрніх і завочных аддзяленняў вышэйшых навучальных устаноў — да заканчэння бягучага курсу навучання;

слухачам падрыхтоўчых аддзяленняў вышэйшых навучальных устаноў — да заканчэння навучання;

навучэнцам агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, прафесіянальна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, у тым ліку вячэрніх і завочных форм навучання,— да іх заканчэння.

Адтэрміноўка ад прызыву на тэрміновую ваенную службу для атрымання ваенна-тэхнічных спецыяльнасцей прадастаўляецца юнакам, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту і вучацца ў навучальных установах, на ўвесь перыяд навучання.

Адтэрміноўка ад прызыву ў сувязі з дэпутацкай дзейнасцю прадастаўляецца прызыўнікам з ліку народных дэпутатаў на тэрмін іх дэпутацкіх паўнамоцтваў.

Прызыўнікі, якія страцілі падставы для атрымання адтэрміноўкі, а таксама асобы, якія не маюць права на адтэрміноўку або падстаў для вызвалення ад прызыву, прадугледжаных пунктам 3 гэтага Часовага палажэння, не прызваныя па розных прычынах на тэрміновую ваенную службу ва ўстаноўленыя тэрміны, павінны быць прызваны пры правядзенні чарговага прызыву.

3. Вызваленне ад прызыву на тэрміновую ваенную службу

Ад прызыву на тэрміновую ваенную службу вызваляюцца грамадзяне:

у мірны і ваенны час — якія знаходзяцца на службе ў органах міліцыі і ваенізаванай пажарнай аховы Міністэрства ўнутраных спраў, а таксама залічаны на вучобу ў навучальныя ўстановы гэтага міністэрства;

у мірны час — родныя браты якіх загінулі або памерлі ў перыяд праходжання тэрміновай ваеннай службы. Прызыўнікі, якія маюць права на вызваленне ад прызыву на гэтай падставе, могуць быць прызваны на тэрміновую службу па іх жаданню.

*** У выпадку, калі бацькі не маюць іншых працаздольных асоб, абавязаных у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам утрымліваць іх незалежна ад таго, пражываюць яны разам з імі ці асобна.**

Непрацаздольнымі бацькамі лічацца:

бацька старэй за 60 гадоў і маці старэй за 55 гадоў;

бацька і маці — інваліды I і II групы незалежна ад узросту.

НА ТЭМУ ДНЯ

«Каралі» бензакалонак

Фота Васіля ФЯДОСЕНКІ.

Законнае жаданне тысяч аўтауладальнікаў атаварыць свае лімітныя карткі ў апошнія дні ператварылася ў сапраўднае блуканне па пакутах. Многія з іх яшчэ з ночы становяцца ў чаргу ля заправачных станцый, нават без усякай упэўненасці, што нешта атрымаецца.

Затое мала хто сумняваецца ў тым, што апошняе падаражанне бензіну — гэта, як кажуць, толькі «кветачкі». Да сусветных цэн яшчэ далёка. І калі паляку выгадна выкласці ў Гродна за літр 93-га нават 100 рублёў, можна прадбачыць, што нас чакае ў будучым.

Зрэшты, сумаваць даводзіцца не кожнаму. Даўно вядома, што калі для большасці дэфіцыт — гэта сапсаваныя нервы і час, дык для некаторых — цудоўны шанц пагрэць рукі. Гэту ісціну нядаўна яшчэ раз пацвердзіла Гродзенская абласная дзяржгандальінспекцыя на прыкладзе вытворчага аб'яднання «Гроднааблнафтапрадукт» і прадпрыемства «Ваўкавыскнафтапрадукт».

18 мая «Гроднааблнафтапрадукт» атрымаў ад Дзяржкамнафтапрадукта рэспублікі 180 тысяч лімітных картак на бензін. Пры перападліку выявілася нястача сотні картак для аўтамабіляў і дванаццаці—для матацыклаў. Накладной на паступленне лімітных картак у аб'яднанні не было, падведамным прадпрыемствам іх накіроўвалі нават непранумараванымі. Усё гэта стварала спрыяльную глебу для розных махінацый.

Вось, напрыклад, як працуе бухгалтар «Ваўкавыскнафтапрадукта» Ч. Серык, на якую былі ўскладзены абавязкі па ўліку, выдачы і захоўванню лімітных картак. 4 верасня яна выдае аднаму чалавеку адразу 5 картак на продаж бензіну для ўладальнікаў матацыклаў — без указання прозвішча спажыўца, маркі матацыкла, рэгістрацыйнага дзяржнумара, колькасці выдадзенага паліва. Справаздачу аб рэалізацыі і лішках лімітных картак Ч. Серык не складала, несумленна атрыманую выручку (па 3 рублі за кожную картку) у касу прадпрыемства не здавала, а частку грошай прысвойвала. 6 кастрычніка ў яе выявілі нястачу 613 рублёў. У Ч. Серык таксама былі 23 лішнія карткі на продаж бензіну для ўладальнікаў матацыклаў і адна—для аўтамабіляў.

Калі Ч. Серык пайшла ў адпачынак, выдачай лімітных картак пачала займацца бухгалтар В. Коўш, якая таксама спрабавала прысвоіць 520 рублёў.

Ну а што ж робіцца непасрэдна ля бензакалонак? Тут свае «каралі», якіх менш за ўсё хвалююць інтарэсы кліентаў. Супрацоўнікі дзяржгандальінспекцыі, напрыклад, устанавілі парушэнні ў рабоце аднай з калонак на АЗС № 8 Гродна. На кожныя 20 літраў бензіну пакупніка падманвалі на пэўную колькасць гаручага. Нягледзячы на выяўленае парушэнне, аператар Д. Дзянішчык не спыніла работу калонкі, не выклікала метралагічную службу аб'яднання — падман кліентаў працягваўся. Дарэчы, паўторная праверка засведчыла, што ніхто і не думаў наводзіць парадак. У выніку на працягу толькі двух дзён праз гэту калонку аўтауладальнікі недаатрымалі 220,6 літра бензіну на суму 1.323 рублі. Акрамя таго, у той жа Д. Дзянішчык выявілі нястачу 28 літраў аўтамабільнага масла.

Але гэта дробязі ў параўнанні з тым, як дзейнічае аператар АЗС № 1 прадпрыемства «Ваўкавыскнафтапрадукт» В. Куцаева. 5 кастрычніка яна рэалізоўвала спажыўцам бензін маркі АІ-93 па камерцыйнай цане (35 рублёў за літр) праз калонку № 6. Дык вось, на кожных 50 літрах кліенты падманваліся на 1 літр. Інвентарызацыя выявіла ў Куцаевай лішкі ў 373 літры бензіну па камерцыйных цэнах на суму 13.055 рублёў. Да таго ж, у яе аказаліся 302 літры лішняга бензіну, прызначанага для рэалізацыі па лімітных картках. У дадатак Куцаева схавала ад свабоднага продажу пакупнікам 3 бляшанкі аўтамабільнага масла, 89 бляшанак тармазной вадкасці, 24 флаконы фрыктолу і 48 фільтруючых элементаў.

В. Куцаева аштрафавана на 7 тысяч рублёў. Але ці стане гэта ўрокам для ўсіх тых, хто адчувае сябе на бензакалонках сапраўдным каралём?

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Розгалас

Розгалас

ДАРОСЛЫЯ—ЗА КАЎБАСУ, А ДЗЕЦІ—ЗА МОВУ?

Незвычайных дэманстрантаў сустракалі ўчора дэпутаты, якія выходзілі пасля дзённага пасяджэння з Дому ўрада. Пад бел-чырвона-белымі сцягамі мітынгавалі на гэты раз... дзеці.

Навучэнцы Беларускага гуманітарнага ліцэя (адзінага беларускамоўнага ў Мінску) прыйшлі на плошчу Незалежнасці падтрымаць беларускую мову, абараніць яе ад знішчэння «двуязычьем». Гэта быў сапраўды незвычайны мітынг. Вясёлы, гарэзлівы настрой, дэкламаванне вершаў, звонкія дзіцячыя галасы—як гэта ўсё адрозніваецца ад трагічна-натужлівых эмоцый дарослых.

Віталь ЦЫГАНКОЎ.

ВЫСТРАЛ З МІНУЛАГА?

КАМЯНЕЦ. (Ю. Фёдарава). У Белавежскай пушчы, як вядома, паляванне забаронена. Там больш цяжка ўявіць яго ў вальерах. Там, за трывалай агароджай, жывуць зубры, алені, дзікі. Вось прадстаўніку аднаго з іх і не пашанцавала. [illegible] з іх быў забіты [illegible], а туша знікла. Такога дзёрзкага браканьерства дагэтуль у пушчы не было. Калі, канешне, не лічыць паляванняў у гэтых угоддзях вяльможных [illegible] у недалёкім мінулым гадзе.

ЦІ ВАРТА АЎЧЫНКА ВЫРАБУ?

ЛЕЗНА. Мясцовы выканкам зрабіў «сюрпрыз» мясцовым аматарам «зялёнага змея», рэзка ўзняўшы цэны на паслугі медвытрэзвіцеля. Цяпер пры заработнай плаце «кліента» да 3 тысяч рублёў цана абслугоўвання будзе складаць 500 рублёў, ад 3 да 6 тысяч—1 тысяча «драўляных», ад 6 да 9 тысяч—1,5 тысячы, а звыш 9 тысяч рублёў—2 тысячы. Цяпер прыходзіцца задумацца, ці варта аўчынка вырабу.

ВАЛЮТНЫ РЫНАК


Курсы куплі-продажу замежных валют, устаноўленыя Нацыянальным банкам РБ з 26 кастрычніка 1992 г.

	Курс куплі	Курс продажу
Амерыканскі долар	355	—
Нямецкая марка	228	—
Англійскі фунт стэрлінгаў	500	—
Фінская марка	68	—
Канадскі долар	260	—

Курс продажу не ўказаны, таму што валюта пакуль што не прадаецца.

НАВІНЫ ЭКАНОМІКІ

І ЗНОЎ МІНІ-ТРАКТАР



Першая сотня малагабарытных трактароў МТЗ-082 сабрана на Смаргонскім заводзе агрэгатаў. Магутнасць міні-машыны—12 конскіх сіл. Трактар зручны для работы ў садзе, на агародзе. Прызначаны ён для арандатараў і фермераў. Праўда, толькі для тых, хто мае салідны кашалёк. Цана ж навінкі — 230 тысяч рублёў.

НА ЗДЫМКУ: старшы майстар участка зборкі МТЗ-082 Уладзімір ХАЙНАК дэманструе навінку.

Фота Аляксандра ТАЛОЧКІ. (БЕЛІНФАРМ).

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

Аблюбавалі зладзеі дрот

ГОМЕЛЬ. (У. Пернікаў). Мясцовы завод «Гомелькабель» стаў самым прыцягальным месцам для зладзеяў. Яны аблюбавалі яго па той прычыне, што тут перапрацоўваецца шмат каляровага металу, які дрэнна захоўваецца. Таму і крадуць яго не толькі ноччу, але і ўдзень. Кантынгент зладзеяў розны: нідзе непрацуючыя, вадзіцелі, студэнты і г. д. Толькі за 2 мінулыя тыдні супрацоўнікам УУС удалося затрымаць тут амаль 20 злачынных груп, якія ўкралі з прадпрыемства некалькі тон электрадроту. А што ж кіраўніцтва завода, які стаў «прахадным дваром» для аматараў лёгкай нажывы? Яно разводзіць рукамі, замест таго каб навесці парадак ва ўліку і захоўванні каштоўнага металу.

Стрэлы, яшчэ раз стрэлы

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ. (У. Пернікаў). Апошнім часам тут пабольшала аматараў асабістай зброі. Нярэдкія трагічныя выпадкі менавіта па іх віне. Так, ачмурэлы ад спіртнога рабочы саўгаса «Капаткевіцкі» Петрыкаўскага раёна В. Плешкуноў у час сваркі з вадзіцелем ПМК С. Спігановічам, стрэліў у яго з абрэза паляўнічага ружжа. Вынік сумны: абодва атрымалі раненні і трапілі ў бальніцу.

У бальніцу быў дастаўлены і нідзе не працуючы 18-гадовы жыхар в. Пясочная Буда Гомельскага раёна К. Лаўроў, які спрабаваў стрэліць з самаробнага прыстасавання і моцна параніў сябе. А ў Светлагорску работнікі міліцыі сярод белага дня адабралі абрэз-вінтоўку і чатыры страляныя гільзы ў рабочага завода «Светлагорсккарммаш» С. Бялько.

Па ўсіх трох выпадках вядзецца следства.

На пытанне свет-люстэрка адказалі цырульнікі

Відаць, 34-гадовай медсястры 6-й сталічнай клінікі Т. вельмі даспадобы было пытанне з бессмяротнай пушкінскай казкі. Памятаеце: «Я ль на свете всех милее?»

Хто ведае, можа чалавек рыхтуецца да якога-небудзь конкурсу прыгажосці? Па ўсім бачна, хатніх люстэркаў для вызначэння канкурэнтаздольнасці не хапіла, таму Т. вырашыла ацаніць сваю знешнасць у люстэрках дзяржаўных. Узяўшы ў падручныя 19-гадовага дармаеда, накіравалася ў цырульню № 54 ВА «Усход».

...Выйшлі адтуль з двума насценнымі люстэркамі. Але адысці далёка не паспелі — дагналі самі цырульнікі.

Сяргей РАЧЫЛА.

3432—3

Выпуск «Розгаласа» падрыхтавалі: І. Карней, А. Коктыш, А. Сланеўскі, С. Сулкоўскі, І. Шчучэнка, У. Здановіч.

СССР ЖЫВЕ?

«Ці лічыце вы неабходным адраджэнне адзінай саюзнай дзяржавы?» — такое пытанне было зададзена спецыялістамі Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў 1.130 грамадзянам Беларусі. Апытвалася дарослае насельніцтва рэспублікі, пры гэтым кантраляваліся шэсць параметраў (пол, узрост, адукацыя і г. д.). Вось якія адказы былі атрыманы (у працэнтах):

Так—47,9
Не—22,0
Узнікалі цяжкасці з адказам—29,5
Не адказалі—0,6

Цікава, што, як высветліў НІСЭПД, 9,4 працэнта з тых, хто 17 сакавіка 1991 года прагаласаваў за Саюз, цяпер змянілі свой пункт гледжання, а 9,8 працэнта з галасаваўшых супраць СССР, наадварот, сёння жадалі б яго адраджэння. У цэлым гэта сведчыць аб тым, што грамадская думка па пытанню аб СССР у Беларусі далёка [illegible] ўстойлівая.

РІД.

ПІНСКІ МОТАБОЛ НА ЭКРАНЕ ААН

Амаль 20 гадоў Пінск па праву лічыцца мотабольнай сталіцай рэспублікі. Палескі горад і зараз дыктуе моду ў гэтым папулярным відзе спорту. Тут дзейнічае буйнейшы ў Еўропе мотабольны комплекс, паспяхова выступаюць у розных турнірах дзве першакласныя каманды—«Аўтамабіліст» і «Дружба». Горад над Пінай прымаў нават удзельнікаў чэмпіянату Еўропы.

У апошнія гады вялікую цікавасць да мотабола праяўляюць у ЗША, Англіі, Бразіліі, Фінляндыі, нават Новай Зеландыі, у іншых краінах. Каб задаволіць гэты інтарэс, амерыканскія прадзюсеры знялі фільм аб пінскім мотаболе. Яго назва — «Захапляючая гульня», а [illegible] Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

ПЕРШЫ ТАЙМ МЫ АДЫГРАЕМ, А ВОСЬ ДРУГІ...

Ну вось і дачакаліся. Сёння, 28 кастрычніка, у 17.30 на стадыёне «Дынама» ў Мінску нацыянальная зборная Беларусі па футболу правядзе свой першы афіцыяльны матч. Яе сапернікам будзе зборная Украіны. На жаль, прыбывае яна — не ў [illegible] складзе — Украінская федэрацыя футбола прыняла рашэнне вызваліць ад удзелу ў матчы футбалістаў кіеўскага «Дынама» з-за вялікага значэння іх гульні з бельгійскім «Андэрлехтам». А вось у нашай зборнай будуць іграць усе «зоркі» беларускага футбола — і «хатнія», і прыхадзьшы — з ужо [illegible] Алейнікаў з Мяцліцкім.

Дарэчы, на першапачаткова запланаваны час пачатку матча (18.00) [illegible] паведнікі. Так што ў інтарэсах балельшчыкаў, каб сярод футбалістаў бязгрэшных было як мага менш, а то хто ж у другім тайме гуляць будзе...

Віктар ДЗЯТЛІКОВІЧ. (БелаПАН).

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

РУСТЫ НЕ ПРОЙДУЦЬ!

Паводле слоў Галоўнакамандуючага Аб'яднанымі Узброенымі Сіламі СНД Я. Шапашнікава, 4—5 лістапада ў Маскве міністры абароны дзяржаў Садружнасці павінны парафіраваць пагадненне аб адзінай сістэме процілаветранай абароны.

Я КОМІ ВЫВУЧЫЎ БЫ... ТОЛЬКІ ЗА ШТО!

За тысячу рублёў у месяц. Менавіта такія надбаўкі да зарплаты журналістаў рэспубліканскай тэлерадыёкампаніі «Комі гор» увёў яе старшыня А. Шарапаў за веданне мовы комі. Аб надбаўках за прымяненне мовы на практыцы ў загадзе нічога не сказана.

АБСЛУЖЫЛІ ХУТКА, АЛЕ ГРАНАТАЙ

Днямі двое тэрарыстаў кінулі гранату на тратуар перад уваходам у закусачную хуткага абслугоўвання «Макдональдс» на Пушкінскай плошчы ў Маскве. У выніку выбуху паранены 8 чалавек, сярод іх асабліва цяжка—пяцігадовая дзяўчынка. Як паведаміла прэс-служба МУС, тэрарысты затрыманы на месцы злачынства, іх асобы высветлены, зараз вядзецца следства. Паводле папярэдніх даных, злачынцы не належаць да «каўказскай мафіі».

САМАЗАБОЙСТВА ЎЧЫНЯЦЬ НЯВЫГАДНА

Новы від страхавання — ад самазабойства—прапануе сваім кліентам новасібірская страхавая кампанія «Зілант». Заплаціўшы ўзнос 10 тысяч рублёў, уладальнік дагавора атрымае прыз у 40 тысяч рублёў, калі будзе жыць 20 гадоў пасля заключэння дагавора. Калі смерць наступіла натуральным шляхам, то нашчадкі атрымаюць 100 тысяч «драўляных».

ЗГОДНА ВОПЫТУ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Невядомы спартыўны дэльтаплан з'явіўся ў зоне сухумскага аэрапорта, перапоўненага бежанцамі ,і, падляцеўшы з неасветленага боку да будынка аэравакзала, скінуў бомбу. Па шчаслівай выпадковасці ніхто з чатырох соцень чалавек, што былі ў будынку, не пацярпеў.

БелаПАНарама

НА ЗЯМЛІ, ДЗЕ ШТО НІ КРОК—ТО КУРАПАТЫ...

Паводле паведамлення агенцтва «Рэйтэр», Міхаіл Гарбачоў у афіцыяльным лісце прэзідэнту Польшчы Леху Валенсе абверг выказаныя ў яго адрас Барысам Ельцыным абвінавачванні ва ўтойванні праўды аб Катынскай трагедыі 1940 года, якая каштавала жыцця 15 тысячам польскіх афіцэраў.

Гаворачы пра свае адносіны да гэтай справы, Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч у інтэрв'ю карэспандэнту БелаПАН заявіў, што Барыс Ельцын атрымаў дакументы па расстрэлу ў Катыні польскіх афіцэраў да 30 снежня мінулага года. Ва ўсякім разе у перадапошні дзень 1991 года прэзідэнт Расійскай Федэрацыі, знаходзячыся ў Мінску, сказаў С. Шушкевічу, што атрымаў ад Міхаіла Гарбачова ключ ад сейфа, дзе былі найважнейшыя матэрыялы, у тым ліку і па катынскай справе.

Як заявіў С. Шушкевіч, гэтыя дакументы пацвярджаюць, што ваеннапалонныя польскія афіцэры былі расстраляны з ведама і фактычна па даручэнню Палітбюро ЦК КПСС, без суда і следства. Тым самым, лічыць старшыня беларускага парламента, дакументы сведчаць, што КПСС была злачыннай арганізацыяй. С. Шушкевіч ставіць пытанне, чаму дакументы не прымаюцца да ведама Канстытуцыйным судом Расійскай Федэрацыі, які разглядае зараз так званую «справу КПСС», яны ж яскрава сведчаць аб злачыннасці гэтай арганізацыі і яе кіраўніцтва.

«Шалёным крывадушшам» назваў Станіслаў Шушкевіч заключэнне створанай для расследавання катынскай справы камісіі, якая забойцамі назвала не сапраўдных катаў, а нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

— Бурдэнка, Аляксей Талстой, цвет сусветнай інтэлігенцыі... — працягваў С. Шушкевіч. — Дзе ж сумленне гэтых людзей? Як яны маглі паставіць свае подпісы пад хлуснёй? Гэта страх прымушаў іх так рабіць...

Далей Станіслаў Станіслававіч правёў паралель з сённяшнімі спробамі пэўных сіл давесці, што Курапаты — гэта справа рук не сталінскіх служкаў, а таксама акупантаў з Захаду. «Гэта таго ж складу людзі, — падкрэсліў С. Шушкевіч. —І я думаю, іх напаткае такі ж лёс—ім будзе сорамна за тое, што яны робяць».

Алесь ЛІПАЙ.

3432—3

ЛІТВА РАЗЛІЧЫЦЦА З ДАЎГАМІ

Зноў запрацавала Ігналінская АЭС. Цяпер электраэнергія ў Літве будзе падавацца ўсім спажыўцам без абмежаванняў, а цеплавыя электрастанцыі рэспублікі пачнуць працаваць у рэжыме эканоміі нафты і газу. Акрамя таго, Літва зможа вярнуць 10 мільёнаў кілават-гадзін энергіі, якія задаўжала сваім суседзям, у тым ліку і Беларусі.

Андрэй КОРСАК, Вільня.

•••

Міністр фінансаў Украіны Рыгор Пятачэнка і старшыня Нацыянальнага банка Вадзім Гецьман на прэс-канферэнцыі ў Кіеве на пытанне аб увядзенні грыўны паведамілі, што грашовая маса ўжо завезена на Украіну, а ў бліжэйшы час будзе дастаўлена і разменная манета.

НЯМА МІРУ ПАД АЛІВАМІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зараз мы ўжо ведаем, што да акцыі італьянскага алею не можа быць ніякіх прэтэнзій — гэта даказалі праверкі [illegible] санэпідэмстанцый усіх узроўняў. Вось пункт гледжання галоўнага санітарнага ўрача рэспублікі Ф. Германовіча:

— Якасць прадуктаў, якія паступаюць з італьянскага боку па лініі гуманітарнай дапамогі, заўсёды выдатная — [illegible] фактаў у нас проста няма. А як [illegible] прадукцыя з далёкага замежжа, усім нам цяпер павінна быць ясна. Сённяшні канфлікт — добрая навука.

Аднак чаму такая, з дазволу сказаць, навука была ўсім нам бокам? Чаму заўсёды спазняемся і махаем кулакамі пасля бойкі, а [illegible] толькі пасля скандалу?

...Якія пратэнзіі можна прад'явіць [illegible] гаспадыням? Яны ж у сваім жыцці толькі і бачылі, што [illegible] ровіна масла ды сланечнікавы алей. Тыя, хто з «наменклатуры» — яшчэ, можа, і турэцкі аліўкавы алей з іншым колерам і смакам. Адкуль жа «няграматным» жанчынам ведаць, што прадукт зусім неабавязкова ставіць у халадзільнік? Праўда, і пасля з гэтага ён не страчвае спажывецкіх якасцей, а проста робіцца больш вязкім.

Вось і паставіла наша саўковае бязладдзе ўсіх нас у [illegible] становішча. [illegible]

[illegible] інфармацыя па радыё і ў друку, вылятае «вутка» зусім не з аліўкавай галінкай у дзюбе.

Пасол Італьянскай Рэспублікі сеньёр Бертынета дыпламатычна, але разам з тым цвёрда заўважыў:

— Якасць усёй партыі гуманітарнага грузу [illegible] пацверджана італьянскімі спецыялістамі — [illegible] дакументацыю ў Беларусь. Не разумею, навошта камусьці трэба было ствараць штучны шум, рабіць такую хвалю вакол прадукцыі, вырабленай у маёй краіне. Мы, здаецца, гэтага не заслужылі.

[illegible]

КРОПКУ НАД «І» у гэтым паставіў намеснік Старшыні Саўміна рэспублікі І. Кенік, які звярнуўся да пасла Італіі з такімі словамі:

— Мы ведаем, пан Бертынета, як многа вы працуеце над [illegible] гуманітарнай дапамогі нашай Беларусі, над умацаваннем адносін паміж нашымі дзяржавамі, [illegible]. Ад сябе асабіста прыношу вам прабачэнні за несумленную інфармацыю, што прагучала па радыё і якая ўскосным чынам нанесла ўрон гэтым адносінам. Спадзяюся, аднак, што яны ў далейшым не будуць [illegible].

Прагучала, між іншым, і думка, [illegible]

[illegible] партый лімонаў і алею, італьянцы маюць намер пастаўляць нам гэтай зімой... бульбу і прадукты з яе.

Валерый ЧАРНЯЎСКІ,
аглядальнік «Звязды».

Беражыце здароўе ў пятніцу. І кожны дзень

Многія чытачы просяць нас паведамляць аб неспрыяльных днях, бо ад гэтага залежыць стан здароўя і самаадчуванне. 30 кастрычніка ў пятніцу будзе чарговы, апошні ў кастрычніку, неспрыяльны дзень. Будзьце асабліва ўважлівымі з 18 да 20 гадзін. Рэкамендуецца больш быць на свежым паветры, праветрываць жыллё, выконваць прадпісанні ўрачоў.

ДА ВЕДАМА



Валюкевіч Уладзімір

Гэты худзенькі падлетак з сур'ёзнымі вачамі можа памерці праз 2 месяцы... Калі вы яму не дапаможаце, здарыцца непапраўнае. У параўнанні з чалавечым жыццём гэта вельмі нямнога — 1000 долараў для таго, каб прайсці апошні курс лячэння ў Амерыцы.

Ратуючы жыццё дзіцяці, вы ратуеце і сваю душу, жыццё будучых пакаленняў. Не дапускайце думкі, што дапамогуць іншыя. Наяўныя валютныя сродкі прымаюцца па адрасу: Мінск, вул. Сурганава, 37, к. 2. Рублёвыя сродкі па безнаяўнаму разліку пералічвайце на рахунак 700517 у БПІБ «Прыорбанк» у Мінску з адзнакай «На лячэнне У. Валюкевіча».

БЕЛАРУСКАЕ РЭСПУБЛІКАНСКАЕ ТАВАРЫСТВА «ДЗЕЦІ У БЯДЗЕ».

interfax ИНТЕРФАКС

РАДЫЁЗВАРОТ ШЭВАРДНАДЗЕ ДА НАРОДА

Грузінскі лідэр Эдуард Шэварднадзе заявіў, што першачарговай задачай новага парламента будзе прыняцце закона аб уладзе. «Грузіі неабходна моцная выканаўчая ўлада,—сказаў ён, выступаючы ў панядзелак па радыё.—Фарміраванне такой улады наперадзе».

Закрануўшы пытанне аб прысутнасці расійскіх войск на тэрыторыі Грузіі, Э. Шэварднадзе заявіў, што яно пакуль апраўдана, і ў інтарэсах Грузіі, каб расійскія войскі знаходзіліся на яе тэрыторыі.

АБХАЗІЯ ВЫСТУПАЕ СУПРАЦЬ ПЕРАДАЧЫ ГРУЗІІ КАРАБЛЁЎ ЧАРНАМОРСКАГА ФЛОТУ

Прэс-служба Вярхоўнага Савета Абхазіі са спасылкай на «добра інфармаваныя колы, блізкія да кіраўніцтва акупацыйных войск у Сухумі», паведаміла аб дамоўленасці паміж кіраўніцтвам Грузіі і камандаваннем часцей Чарнаморскага флоту, што дыслацыруюцца на тэрыторыі рэспублікі, «інсцэніраваць захоп баявых караблёў, якія базіруюцца ў раёне Поці». У заяве, распаўсюджанай у нядзелю, гаворыцца, што «гэтыя караблі патрэбны грузінскаму кіраўніцтву для ажыццяўлення баявых аперацый супраць сіл самаабароны Абхазіі».

Прэс-служба асудзіла прэтэнзіі Грузіі на караблі Чарнаморскага флоту. Яна напомніла, што пастанова расійскага парламента ад 25 верасня «Аб грамадска-палітычнай сітуацыі на Паўночным Каўказе ў сувязі з падзеямі ў Абхазіі» рэкамендуе прэзідэнту і ўраду Расійскай Фэдэрацыі аб'явіць мараторый на перадачу Грузіі любога ўзбраення да ўрэгулявання канфлікту ў Абхазіі.

У ЗОНЕ КАНФЛІКТУ Ў АБХАЗІІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА ЛАКАЛЬНЫЯ ПЕРАСТРЭЛКІ

Паводле паведамлення Міністэрства абароны Абхазіі, у нядзелю ў напрамку Эшэры—Сухумі не спынялася перастрэлка з прымяненнем цяжкіх гармат. Ноч на 26 кастрычніка прайшла адносна спакойна. Ранены адзін ваеннаслужачы абхазскай арміі.

У Ачамчырскім раёне Абхазіі ідуць асобныя баі за кантроль над камунікацыямі.

Па сцвярджэнню Міністэрства абароны Абхазіі, у сувязі з няспыннымі абстрэламі пазіцый расійскіх ваеннаслужачых апэратыўнай групай Міністэрства абароны РФ прынята рашэнне адказваць агнём на агонь. У выпадку пападання снарадаў на тэрыторыю ахоўваемых расійскімі войскамі аб'ектаў ім аддадзены загад адкрываць агонь на паражэнне без папярэджання.

Між тым, паводле даных з грузінскіх крыніц, мінулая ноч у Сухумі і яго наваколлях прайшла спакойна. Не зарэгістравана якіх-небудзь ускладненняў і ў Ачамчырскім раёне.

Deutsche Presse-Agentur GmbH dpa

СПАРТЫЎНЫЯ АЎТАМАБІЛІ ПАКУЛЬ ШТО НЕ ДЛЯ НАС

ЛІСАБОН. Вядомая японская фірма «Мазда» перамагла крочыць па еўрапейскім рынку. Яна прадала на апошнім 1,7 мільёна матацыклаў. Разам з тэхналагічнымі дабаўкамі «Ролс-ройса», «Таёты» і «Мерседэса» матацыклы «Мазда» карыстаюцца найбольшым попытам сярод тэхнікі свайго класа. Апошнім часам японская фірма плануе запусціць у серыйны паток старшы легендарны спартыўны аўтамабіль МХ-7 у Лісабоне.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

У газеце «Звязда» за 11 верасня г. г. апублікаваны матэрыял А. Сланеўскага «Рукі ўрада звязаны законамі...» аб пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў рэспублікі, якое адбылося 08.09.92 г.

Выкладаючы змест выступлення Старшыні Савета Міністраў Кебіча В. Ф., А. Сланеўскі дапусціў грубае скажэнне яго выказванняў. У прыватнасці, з апублікаванага матэрыялу (гл. апошні абзац) вынікае, быццам Кебіч В. Ф. абвінаваціў пракуратуру ў тым, што яна становіцца на абарону хапугі, хабарніка, злодзея, нават калі яны прыціснуты фактамі. Такое сцвярджэнне не мае нічога агульнага з рэчаіснасцю і зневажае работнікаў пракуратуры.

Як прысутны на вышэйпамянёным пасяджэнні, афіцыяльна заяўляю, што ні Кебіч В. Ф., ні іншыя асобы, якія выступалі на Прэзідыуме, нічога падобнага ў адрас пракуратуры не выказвалі. Пацвярджэннем маёй заявы з'яўляецца і фанаграма пасяджэння, што захоўваецца ў Савеце Міністраў. Больш таго, аб фактах злоўжыванняў службовым становішчам, пра якія гаварылася ў выступленні Кебіча В. Ф., было паведамлена Савету Міністраў Пракуратурай рэспублікі.

Такім чынам, вольна ці міжволі, А. Сланеўскі дапусціў дыскрэдытацыю органаў пракуратуры, чым груба парушыў артыкулы 24 і 32 Закона «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». Выклікае шкадаванне, што такая публікацыя з'явілася ў старэйшай беларускай газеце, якая карыстаецца заслужаным аўтарытэтам.

У. КАНДРАЦЬЕЎ,
в. а. Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь.

З ДЫКТАФОННАЙ СТУЖКІ ЯЎГЕНІІ ЯРЦАВАЙ: РАДЫЁМОСТ ЭКС-ПРЭЗІДЭНТА СССР

«Гарбачоў слоў на вецер не кідае...»

Экс-прэзідэнт СССР прыняў удзел у радыёмосце, арганізаваным радыёстанцыяй «Рэха Масквы». Міхаіл Сяргеевіч на працягу трох гадзін адказваў на пытанні слухачоў, рабіў заявы, даваў ацэнкі. Наш маскоўскі карэспандэнт запісала гэту перадачу, найбольш цікавыя фрагменты з якой прапануем вашай увазе.

Рэдакцыя «Звязды» мае намер прадоўжыць гэту рубрыку. Мы пазнаёмім вас з запісамі, зробленымі ў Канстытуцыйным судзе Расіі, у Крамлёўскіх кабінетах, на дыпламатычных прыёмах, прэс-канферэнцыях, у эксклюзіўных гутарках са славутасцямі.

Сачыце за новай рубрыкай!

КРЫЧАЛІ: «ДАЙЦЕ НАМ БАРЫСКУ!»! ВОСЬ І АТРЫМАЛІ...

Прэзідэнт, яго ўрад апынуліся ў такім становішчы, што не ведаюць, што далей рабіць. Пазіцыя Гарбачова ім не падабаецца!.. Расійскія ўлады манеўруюць. Яны бачаць, што робяць глупствы. Неверагодна! Справа і злева рукі рвуцца да глоткі Гарбачова.

І, па-другое. Скандал з тым, з адным, з трэцім. А вось калі Гарбачова паспрабаваць вывесці з раўнавагі, прынізіць, выбіць яго з каляіны і заткнуць яму глотку... А я стаўлю прама пытанні, што, калі вы не можаце, — скажыце. Мы давайце разам рабіць. Нельга ж, каб мы ішлі да абвалу, а потым на плошчах зноў натоўпам вырашалі і лозунгамі. «Дайце нам Барыску!» Вось і атрымалі Барыску. Ну, давайце зараз дапаможам яму, калі ён хоча. Я не бачу, што ён хоча гэтага. Таму я вельмі востра гавару, хаця, вы ведаеце, Гарбачоў любіць фразы такія стрыманыя, разлічаныя на роздум, спакойныя. Але сёння трэба ўжо не проста гаварыць, крычаць трэба. Бо сышліся, супадаюць інтарэсы і правых, і сённяшніх улад, каб дабрацца да горла Гарбачова, учыніць скандал і павесці народ..

ПРА БЫКА І ЮПІТЭРА

Пытанне: Ці не лічыць Міхаіл Сяргеевіч, адмаўляючыся ісці ў Канстытуцыйны суд, што робіць па прынцыпу перавернутай прымаўкі: што павінен рабіць бык, тое можа ігнараваць Юпітэр? Я, на жаль, адчувальная да палітычнай шызафрэніі, бо ўсё жыццё пражыла ў грамадстве, якое ўзначальвалася былой партыяй Міхаіла Сяргеевіча..

М. Гарбачоў: Там (у Канстытуцыйным судзе. — **Я. Я.**) гаворка ідзе не аб прававых пытаннях. Там разглядаюць і судзяць гісторыю. Там сутыкаюцца палітычныя сілы, што праследуюць розныя мэты. Адны — за тое, каб вярнуць краіну назад, у мінулае. Другія маюць іншыя мэты. Ва ўсякім разе, з гэтага суда так і не атрымаўся працэс юрыдычны. Гарбачоў не паставіць свой аўтарытэт для таго, каб падмацаваць гэты працэс, які ў грамадстве ўжо цяпер пачынае разумецца як палітычная бойка.

Калі ў Амерыцы адмоўна ставяцца да таго, што Гарбачоў не з'яўляецца ў якасці сведкі на Канстытуцыйны суд, я павінен сказаць наступнае. Я думаю, і ў Расіі, і ў Еўропе, і ў Амерыцы ўжо добра ведаюць Гарбачова і тыя каштоўнасці, якім ён адданы. І ведаюць, што слоў на вецер ён не кідае...

ХОДЗЯЦЬ ТЫЯ, КАГО НЕ ЗАПРАШАЛІ

Пытанне: Вашы таварышы па Палітбюро, па КПСС адгукнуліся на выклік у суд. Нават Лігачоў, Рыжкоў і людзі, якія бліжэй да Вас, як Фалін. Адгукнуўся і Аляксандр Якаўлеў.

М. Гарбачоў: Тут вы нагадалі аб маіх партнёрах, аб маіх старых калегах. У нас жа ўжо няма Палітбюро, і ніхто ніколі цяпер не абавязваў займаць адзіную пазіцыю. Кожны робіць па сумленню, у кожнага свае аргументы, сваё разуменне. У Гарбачова ёсць сваё разуменне, і яно, між іншым, вельмі часта адрознівалася, у тым ліку ад тых, хто ўжо там даў паказанні. Там жа ёсць некаторыя, якіх не запрашалі, а яны ўвесь час ходзяць. Ну, гэта іх пазіцыя. Я іх не асуджаю.

ШТО ЁСЦЬ РОЎНАСЦЬ ПЕРАД ЗАКОНАМІ

Радыёслухачка: Калі ў 1987 годзе Ельцына ўтоптвалі ў гразь, у яго не было магчымасці выступіць з адказам на абвінавачванні. Радыёстанцыя «Рэха Масквы» тады не існавала, ніводная газета не дала яму магчымасці расказаць аб сваёй пазіцыі. А цяпер вы, Міхаіл Сяргеевіч, маеце поўную магчымасць зрабіць гэта. «Комсомольская правда»? Калі ласка! Іншыя выданні? Яны таксама прадастаўляюць вам свае старонкі, а радыёстанцыі, у тым ліку «Рэха Масквы», — свой эфір. І Міхаіл Сяргеевіч можа выказаць усё, што думае пра Барыса Мікалаевіча, ды і наогул аб усім, што ён хоча. Сёння радыё «Свабода», не закранаючы, так сказаць, ніякіх бакоў паводзін Міхаіла Сяргеевіча, проста дала юрыдычную кансультацыю аб законах, якія датычаць абавязковай яўкі ў суд любога грамадзяніна Злучаных Штатаў. Незалежна ад той пасады, якую ён займаў у мінулым або займае цяпер. Так было ў адносінах да Рэйгана, гэтак жа было адносна Картэра, або, скажам, да Норта. Пры гэтым у чалавека, калі ён адмаўляецца з'явіцца ў суд, адбіраюць замежны пашпарт, яму забараняецца выезд з краіны, і ён можа быць па суду пакараны нават пазбаўленнем волі.

М. Гарбачоў: Гэта, як я разумею, гаварыла прыхільніца палітыкі Барыса Ельцына. Ну, што ж, ёсць такія, і апытанні гэта пацвярджаюць. І я не спрачаюся з імі, няхай яны не губляюць веры... Але калі вы мне гаворыце, як робяць у Злучаных Штатах Амерыкі з тымі, хто не з'яўляецца ў Канстытуцыйны суд і гэтак далей, то я проста хачу вам сказаць: я дагэтуль з'яўляюся грамадзянінам Расійскай Федэрацыі.

ДАСЬЕ МЕЛАМАНА

Рок-тэрапія па рэцэпту «Сузор'я»

СПОЎНІЛАСЯ 15 ГАДОЎ СТАРЭЙШАЙ РОК-ГРУПЕ БЕЛАРУСІ

Каб у якога крытыка хапіла цярпення засесці за складанне анталогіі беларускага року, то нягледзячы на разнабой прыхільнасцей і антыпатый, ён без ваганняў пачаў бы з «Сузор'я». Факт неаспрэчаны часам. Хоць старэйшая рок-група Беларусі і ўступіла ў сваю «юнацкую» фазу развіцця, тым не менш ужо не адно пакаленне меламанаў праспявала дыфірамбы ў адрас неперасягненых хард-н-хеві на ўскрайне некалі сярпаста-малатастай імперыі.

Увогуле выпадкова сабраўшыся ў 1977 годзе, трое студэнтаў розных ВНУ Мінска доўгі час потым не сыходзілі з небасхілу сталічнага андэграўнда. Не прэтэндуючы на нейкую канкурэнцыю эстрадна-джазавым ВІА, Андрэй Казлоўскі, Валянцін Пучынскі і Андрэй Філатаў дзякуючы забяспечанаму ўзаемаразуменню ў хуткім часе сталі абавязковымі ўдзельнікамі ўсіх «падпольных» рок-тусовак. Першы, даволі працяглы перапынак музыкантам «Сузор'я» давялося перажыць з 78-га па 80-ы гады, калі іх аднаго за адным прызвалі «ў боты». На шчасце, армія не выбіла з хлопцаў умення і жадання пачынаць практычна з нуля, і пасля некалькіх удалых выхадаў на публіку «Сузор'е» атрымлівае запрашэнне папрацаваць у... сістэме філармоніі. Тады гэта быў нонсенс: неадарваныя ганенні — і раптам запрашэнне пад афіцыйны дах. І ўсё ж такі была ўпэўненасць. Прынамсі, афіцыйная шыльда на той час была больш гарантаваным прыкрыццём ад цэнзуры, чым свабодная творчасць па падвалах.

Ужо ў маі 1981 года мастацкаму савету была здадзена першая праграма, а ў канцы лета пайшлі вялікія гастролі па Прыбалтыцы і Крыме. Дарэчы, удзельнічалі ў некалі папулярным фестывалі «Крымскія зоры», дзе разам з высокім чацвёртым месцам атрымалі званне дыпламантаў.

Але на гэтым лёгкае жыццё скончылася. У хуткім часе Чарненка, які прыйшоў да ўлады, асабіста падпісаў указ аб згортванні дзейнасці ўсіх нефармальных арганізацый, уключаючы і кудлатых рокменаў. У 1983 годзе на падставе пісьмовага загаду «Сузор'е» было расфарміравана. Але любы загад (не зважаючы на асобу, якая яго аддае) можна аспрэчыць. Здаецца, менавіта ў гэты, сапраўды падпольны перыяд, у камандзе наступаў пік творчага пошуку і плёну. Успомніце легендарны альбом «Рок-тэрапія», які ў аматараў року і сёння на слыху. Дык вось, ён быў запісаны ў 1984 годзе ў падвале тэатральна-мастацкага інстытута, паводле слоў Казлоўскага, у жахлівых умовах і пры мінімальным камфорце. Але, як часта гэта бывае, вынік атрымаўся на дзіва добрым.

І ўсё ж, нягледзячы на ідэалагічныя ганенні, выжыць удалося. Каб не апынуцца ў ролі бедных сваякоў, вымушаны былі эксперыментаваць, у прыватнасці, з саставам. На правах салісткі была «задзейнічана» Нэлі Дзянісава, чые магутныя вакальныя даныя не пакідалі сумненняў у правільнасці выбару.

Так, з пераменным поспехам пад уражлівае дзянісаўскае сола «Сузор'е» даволі доўга цягнула сваю лямку пад дахам філармоніі. Невядома, як бы далей склаўся лёс музыкантаў, каб не смерць філармоніі як манапаліста пракату канцэртаў і кузні дамарослых кадраў.

Спробы прапісацца ў «Мінск-канцэрце» ўсё ж аказаліся ўдалымі, але былі нулявымі з фінансавага пункту гледжання. А ў студзені 1991 года за непатрэбнасцю гурт быў выкінуты і адтуль. Відома, усе гэтыя катаклізмы не маглі не адбіцца на далейшым ходзе падзей. Парасткі крызісу жанру ў хуткім часе перараслі ў раскол, юрыдычна аформлены ў сярэдзіне 1991 года. Андрэй Філатаў, Нэлі Дзянісава і дэбютаваўшы незадоўга да гэтага ў групе брат Андрэя Казлоўскага — Аляксей адышлі ад цяжкага року і акунуліся ў хвалю камерцыйнай поп-музыкі.

І зноў трэба было пачынаць з нуля. Але доўга чакаць запрашэнняў не давялося. Злеплены з паветра тэатр песні Ігара Лучанка «Беларусь» (пры бядней беднага Саюзе кампазітараў) запрашаў у свае рады літаральна ўсіх жадаючых. Што датычыць «Сузор'я», то адноўлены на 80 працэнтаў калектыў як ніколі меў патрэбу ў падтрымцы звонку. Але прабавіўшыся цэлы год у кулуарах тэатра— без фінансавай падтрымкі, без гастрольнай дзейнасці, нарэшце, без ранейшага гучнага імя, — Казлоўскі ўрэшце разумее, што лепш за ўсё жыць па прынцыпу «сам па сабе», не зазіраючы ў вочы добраму дзядзьку. Нечы дах — гэта абавязкова залежнасць, а апошняя — не што іншае, як варыянт кабалы.

Любое апякунства рана ці позна аказваецца выцісканнем апошніх сіл пры мінімуме зарплаты. Ні Саюз кампазітараў, ні шматлікія спонсары не ўклалі ў тэатр ні капейкі. Дырэктар — Мікалай Траццякоў — знік у невядомым напрамку. Артысты, адчуўшы будучае фіяска, разбегліся па адной шостай частцы свету.

Але вернемся да «Сузор'я» сённяшняга, тым больш што для гэтага ёсць усе падставы. І хоць свой 15-гадовы юбілей Казлоўскі і яго каманда сустракаюць не з лепшым настроем, але і да глыбокага адчаю таксама далёка. Прынамсі апускаць рукі ніхто не збіраецца. Перспектывы ёсць...

У чарговы раз адбылася кадравая ператасоўка. Цяпер тон усім кампазіцыям будзе задаваць малады і неардынарны саліст Аляксандр Перцаў. Прабачце, я ўсё ж памыліўся. Не толькі Перцаў. Паўторна праведзены эксперымент з жаночым вакалам. Зараз на канвееры — Святлана Гаўрыленка. Але знайсці нешта агульнае паміж тым, што ў свой час рабіла Нэлі Дзянісава, і сённі — Света, проста не ўяўляецца магчымым. Надта яны розныя.

І ўсё ж ні час, ні кадравыя перастаноўкі не адбіліся на стылі, уласцівым толькі «Сузор'ю». На парадку дня, паводле слоў Андрэя Казлоўскага, удасканаленне знешняй формы і ўдакладненне напрамку. Зараз прыярытэт аддаецца кароткай песеннай форме з дастаткова лаканічнай аранжыроўкай без захопленасці «цягучкай», г. зн. хранаметраж не павінен выходзіць за рамкі 5 хвілін. Умоўна — хард-н-хеві, але ўсе разумеюць, што гэта не зусім так, таму будзе больш блізка да ісціны — традыцыйны рок.

Я хацеў назваць «...рок беларускі», але лідэр «Сузор'я» дастаткова безапеляцыйна выказаў сваю пазіцыю наконт гэтага.

— У нас прагрэсіруе рок па-беларуску, які з аднолькавым поспехам можна назваць і турысцкай песняй, і бардаўскай. Але гэта не рок. Рок — перш за ўсё прафесіянальная ігра на якасных інструментах з выкарыстаннем глыбокіх традыцый гэтага жанру. І для гэтага, дарэчы, існуюць пэўныя законы. Як не зблытаеш традыцыйны джаз з авангардысцкім, так нельга не адрозніць уласна рок ад яго шматлікіх адгалінаванняў. Сённяшняя сітуацыя ў Беларусі— меладэкламацыя з элементамі рок-музыкі — не больш таго. У гэтым сэнсе бліжэй да року я палічыў бы тое, што робіць Ваня Маркаў (рытм-энд-блюз па-англійску. — І. К.), а таксама «Зіндан» і некаторыя іншыя па адной простай прычыне: яны моцна прытрымліваюцца традыцыі. І плагіятам, як думаюць многія, тут нават не пахне. Тая ж «Мроя», якая паспяхова іграе свае полькі, таксама лічыць сябе рок-камандай. Хоць тут я паспрачаўся б. А наогул я супраць кананізацыі року па нацыянальнай прыкмеце. Гэта перагіб. Па вялікаму рахунку, хапае тых дзвюх катэгорый, якія дастаткова праверана ходам музычнай гісторыі. Пакінуўшы Амерыку, давайце ўвальёмся хоць бы ў Еўропу. А потым ужо будзем дыскутаваць.

Сапраўды, становішча на нашым музычным рынку патрабуе не аднаго года напружанай работы. А таму шапказакідальніцкі настрой сённяшнім нашым не ў меру задраўшым нос «зоркам» можна было б збавіць, бо наўрад ці ёсць што выносіць у тую ж Еўропу. Акрамя, вядома, смецця.

Таксама шмат можна спрачацца і наконт «адзіна правільнай мовы». І тут таксама цяжка не пагадзіцца з Казлоўскім, які ўпэўнены, што аддаваць ці не аддаваць перавагу той ці іншай мове можна толькі ў кожным асобным выпадку.

— Калі дзесяць гадоў назад мы вынеслі на суд вядомы «Полацкі сшытак» Міколы Гусоўскага, які літасціва прадаставіў нам Адам Мальдзіс, то проста цяжка было ўявіць нейкую альтэрнатыву акрамя беларускай. Але, з другога боку, я ніколі і нідзе не чуў, каб так размаўлялі, як у перакладзе Язэпа Сяміжона. Толькі тады я адчуў, якая прыгожая, пявучая і высакародная наша мова. Такія работы заўсёды падводзяць пад песенную форму. Я гэта да таго, што сёння многія спецыялісты, якія не ведаюць дасканала ні беларускай, ні рускай, не кажучы ўжо пра нешта больш далёкае, пачынаюць прад'яўляць правы і даказваць толькі свой «адзіна правільны» пункт гледжання. З такімі адносінамі наўрад ці можна зрабіць тэкставы прарыў, каб гэта ўсур'ёз некага зацікавіла. Тое самае і з імкненнем заспяваць па-англійску. Мала таго, што заўсёды застаецца прысмак другога гатунку, дык яшчэ напрошваецца пытанне: для чаго гэта ўсё патрэбна і ці патрэбна наогул? Я думаю так: калі сапраўды ёсць нейкае зерне, то мова прынцыповага значэння не мае. Абы толькі ў слухача не ўзнікала адчування дарэмнасці ўсіх тваіх пошукаў. Эксперыменты з мовай павінны быць натуральнымі. Напрыклад, англійская мова «Скорпіёнз» мяне не раздражняе, чаго ніяк не магу сказаць у адрас іншых немцаў. Тое самае і з нашымі музыкантамі.

Вяртаючыся да «Сузор'я», нельга не адзначыць і такі факт. «Каманда Казлоўскага з'яўляецца флагманам року Беларусі, але можна па пальцах пералічыць, калі ёй удавалася «засвяціцца» на газетнай паласе, радые або тэлебачанні. Сродкі масавай інфармацыі зусім не песцілі неардынарны калектыў.

— Механізм «засветкі» ў нас просты, — кажа Андрэй. — Па традыцыі сам артыст або кіраўнік калектыву з туга набітымі кішэнямі бегае па рэдакцыях, абівае парогі тэлецэнтраў у надзеі атрымаць вышэйшае благаслаўленне тамашняга начальства. Не выключана, што ў адным выпадку з дзесяці цябе і заўважаць. Але ці варта аўчынка вырабу? Ва ўсеагульным патоку дылетантызму нашых праграм і выданняў, быццам бы асвятляючых праблемы рок-музыкі, згубіцца гэтак жа проста, як у афрыканскіх джунглях. Што датычыцца нас, то «Сузор'е» стараюцца не заўважаць і з іншай пазіцыі. У свой час мы актыўна займалі антыхалтурную пазіцыю ў адносінах да беларускай мовы, выстаўляючы дастаткова моцныя рускамоўныя рэчы. Людзі, якія лічылі сябе нават рок-паэтамі, былі незадаволены тым, што мы адкрыта ігнаруем іх яўна слабыя «шэдэўры». Менавіта пасля гэтай упартасці нас аўтаматычна перасталі лічыць «сваімі». Хоць у кагорту нейкіх «чужародных» мы ніколі не запісваліся.

Вось з такімі, не вельмі радаснымі думкамі і ўспамінамі падышлі ветэран року, 33-гадовы Андрэй Казлоўскі, і яго маладая каманда да слаўнага юбілею гурта, які сёння стараннямі зацікаўленых асоб незаслужана апынуўся ў цяні. Незаслужана — ужо таму, што хлопцы былі ў нейкім сэнсе першапраходцамі сярод вялікіх акадэмічных караблёў, якія надзейна абыходзілі астравы маладзёжнай культуры. Але ці варта ганяць паветра? Адносіны да гісторыі, і тут ужо не мае значэння, у якой плоскасці, у нас ніколі не былі ўзорнымі. Будзем спадзявацца — пакуль...

Ігар КАРНЕЙ.

ВАШ САД І АГАРОД

Матэрыялы выпуску падрыхтаваў да друку Мікалай ЧАХОЎСКІ (тэл. 32-41-92).

Раіць доктар Мітлайдэр

Апошнім часам шмат размоў пра методыку агародніцтва амерыканскага вучонага-даследчыка Джэкаба Мітлайдэра. Раскажыце, у чым яе адрозненне ад нашай?

Паліна УВАРАВА.
г. Бабруйск.

Пошукі новых методык агародніцтва ўласцівыя чалавеку здавён. Неспакойныя людзі вечна нешта шукаюць, нервуюцца, здараецца, набіваюць сабе шышкі, але з ранейшай настойлівасцю працягваюць даследаванні. А калі нехта доўга шукае, то, вядома, нешта і знаходзіць. Вось і неспакойны амерыканскі вучоны Джэкаб Мітлайдэр вынайшаў... новую методыку вырошчвання агародніны. Пятачок зямлі, скажам, у дзве-тры соткі, сцвярджае і даказвае вучоны, можа пракарміць сям'ю з пяці чалавек на працягу года! І не вельмі важна, які гэта ўчастак — былы кар'ер, лясная дзялянка, пустэча, пясок ці гравій, — ураджай забяспечаны!

Што ж гэта за новы метад? Чым ён адрозніваецца ад традыцыйнага? Ці не перабольшвае вядомы вучоны магчымасці зямлі (нават добрай!) і чалавека?

У некалькіх нашых выпусках раскажам пра ўсё больш-менш падрабязна. Сёння — сама сутнасць метаду вучонага.

Кожны, хто неяк звязаны з земляробствам, заўважыў, што адзін і той жа ўчастак дае розныя вынікі. Побач з нармальнай раслінай вырастае карлікавая, часам яна без усякай бачнай прычыны пачынае хварэць, адстае ў сваім развіцці, гіне.

Галоўная бяда, лічыць Мітлайдэр, у тым, што мы не стварылі аднолькавых стартавых умоў для ўсіх раслін. У працэсе росту беды памнажаліся: некага выдзелілі, даўшы лепшае сілкаванне, глыбей апрацаваную глебу, больш дбайны догляд, асабліва паліў. А трэба ж усё размеркаваць аднолькава — і святло, і цяпло, і сілкаванне, і догляд.

Правільнае, збалансаванае, своечасова ўнесенае ў глебу сілкаванне — аснова метаду амерыканца. Кожны кволы расточак на ўсіх этапах развіцця павінен атрымаць харчаванне не толькі ў патрэбнай колькасці, але і ў даступным выглядзе. Расліна яго не павінна шукаць. Яно заўсёды побач, там, дзе залягаюць карэньчыкі, бо ўносіцца непасрэдна пад расліну. Арганіка — кампосты, перапрэлы гной, чарназёмы, дзярніна, многае іншае — істотнага значэння не маюць. Яны нішто. Уся ўвага — мінеральным тукам. Яны і толькі яны, сцвярджае вучоны, у стане вырашыць задачу.

Раслінам для нармальнага развіцця патрэбна каля 20 элементаў. Адны з іх — азот, фосфар, калій, сера, кальцый —галоўныя, ці макраэлементы. Другія, патрэбнасць у якіх мінімальная (бор, напрыклад), таксама павінны прысутнічаць у патрэбнай дозе. І не ў сухім выглядзе, а ў растворы. Толькі з раствору расліна возьме дастатковую колькасць пажыўных рэчываў. Дакладнасць дазіроўкі — гарантыя росту і ў рэшце рэшт — высокага ўраджаю.

Інакш выглядае сам агарод. Ён роўны, як стол. Кожная градка абмежавана валікам зямлі да 18 см. Пры паліве ні адна кропля вільгаці не будзе страчана. Градка — усяго 45 см у шырыню і 9 метраў у даўжыню (можа быць таксама 3 ці 6 метраў). А вось барозныпраходы амаль у тры разы шырэйшыя — 105 см. Гэта для таго, каб на вузенькіх градках гаспадарыла сонца. Без яго (ды яшчэ на працягу амаль усяго дня) і думаць нельга пра добры ўраджай.

Месцазнаходжанне градак і баразнаў не мяняецца. Кожны новы год, улічваючы распланаваную змену раслін, на градках садзяць новую культуру. Перакопваюць (глыбока, да 30 см) толькі градкі. Барозны не чапаюць.

Пустазеллю на агародзе Мітлайдэра проста няма месца. Вясною, калі толькі з'явіцца шкоднік, скажам, на валіках, якія акружаюць граду, матычкай ці граблямі разакучваецца верхні слой валіка. Пустазелле гіне. Валік зноў аднаўляецца.

Калі ж пустазелле з'явіцца на самой градцы, яго засыпаюць тонкім слоем зямлі з таго ж валіка. Гіне яно і ад высокай канцэнтрацыі мінеральных соляў у растворах, якімі паліваем. З астатнімі спраўляюцца самі расліны. Яны проста закрываюць градку магутным лісцем, бо прайшлі стадыю расады.

Палівы, якія заўсёды з падкормкай, старанныя і даволі частыя. Зямля ніколі не перасыхае. Роўная паверхня дазваляе падсілкаваць удосталь кожны экземпляр.

Гэта без дажджоў. А калі ідуць дажджы, патрэбная колькасць мінеральных угнаенняў (зноў-такі збалансаваных) рассыпаецца па градзе. Раствараючыся з дажджавой вадой, яны кормяць пасадкі.

Як бачым, ніякай арганікі. Амерыканец лічыць, што разам з кампостам, гноем, лісцем мы заносім на грады хваробы. А пробы на чысціню яго прадукцыі, якія заўсёды праводзяцца, указваюць на адсутнасць не толькі нітратаў, але і іншых шкодных кампанентаў.

РЭКОРДЫ ПРЫСЯДЗІБНАГА ЎЧАСТКА

Бурак-волат

Уладзімір Васільевіч і Валянціна Рыгораўна Ляўковічы жывуць у Кобрыне. Побач з домам у іх невялікі агарод. Сёлетняй вясной Валянціна Рыгораўна пасеяла разам з іншай агароднінай сталовыя буракі. Адно з зярнят апынулася на градцы, дзе расла цыбуля.

Буракі выраслі выдатныя, а той, што прысуседзіўся да цыбулі, стаў сапраўдным волатам. Вага яго перавысіла 12 кілаграмаў!

Аляксей САЦУК.
Фота Анатоля ЖУГАЯ.

«Малаціць» трэба ўмеючы

Выспела насенне буракоў. Спрабавала малаціць, а яно не малоціцца... Вольга КАМАРОВА (г. Мінск).

Насенныя стрэлкі буракоў спачатку прасушваюць. Мэтазгодна адрэзаць верхавінкі — там калівы дробныя, часта недаспелыя. Карысці ад іх ніякай—яны могуць і не прарасці. А калі і выкінуць парастак, то ён будзе кволым, добры бурак з такога не вырасце.

Насенне «малоцім» так. Моцна трымаючы сцяблінку, прапускаем яе паміж пальцамі над нейкім лістом ці цэлафанам. Зярняткі асыплюцца. Часткі сцябліны, рознае смецце выкінем адразу. Само насенне на дзень-два пакінем пры пакаёвай тэмпературы. Пасля працярушым, правеем на лёгкім ветрыку і адбяром самыя буйныя калівы. Насенне захоўваюць у папяровых пакетах ці спецыяльных мяшочках.

Час разразаць насенныя агуркі. Яны сталі мяккімі, зярняты ў іх могуць праклюнуцца. Рэжам агурок на дзве роўныя палавінкі. Насенне выбіраем чайнай лыжачкай разам з сокам у талерку. На кухні бродзіць два-тры тыдні. Пасля пераліваем у літровы слоік, заліваем вадой і, перамешваючы, мыем. Усё, што ўсплывае, зліваем. І так да дзесяці разоў. На дне павінны застацца толькі самыя важкія калівы.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

28 кастрычніка

Беларускае тэлебачанне

10.50—11.55. Міжнародны фестываль фальклору «Жыцень». Частка 1-я.
16.30. «Доктар Айбаліт». Мультфільмы 1-ы і 2-і.
16.50. Дзіцячая тэлефілармонія. «Бенжамін Брытэн у Вілейцы».
17.20. Футбол. Таварыскі матч. Зборная Беларусі — зборная Украіны.
19.20. Абласныя навіны (Гомель).
19.30. «Вобраз». Літаратурны часопіс.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа; «Агледзіны». Кароткаметражны фільм; Футбол. Зборная Беларусі — зборная Украіны. Чвэрць гадзіны пасля матча.

Канал «Астанкіна»

11.20. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
12.25. «Ганна Лііса». Мастацкі фільм (Фінляндыя).
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлеміксту.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. «Надзея». Дабрачынны канцэрт для дзяцей-сірот.
17.00. Навіны.
17.25. Вечар тэлебачання Турцыі.
18.00. Г. Свірыдаў. «Маленькі трыпціх».
18.10. «Багатыя таксама плачуць».
18.55. Футбол. Адборачны матч чэмпіянату свету. Зборная Расіі — зборная Люксембурга.
19.50. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Рэпартаж ні аб чым.
20.50. Вечар тэлебачання Турцыі. Мастацкі фільм. «Раскіданая пасцель».
22.20. Ведзі.
23.00. Навіны.
23.25. «Каханне з першага погляду». Дзень 2-гі.
24.00—1.10. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Бізнес: новыя імёны.
15.15. «Тэрмінал». Рэпартаж з міжнароднай канферэнцыі па камп'ютэрнай графіцы.
15.45. Далёкі Усход.
16.30. Там-там-навіны.
16.45. Хрысціянская праграма. «Брус Стэйсі і яго «каралеўства».
17.15. Паралельныя светы.
18.00. Апазіцыя.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Сам сабе рэжысёр.
19.50. «Санта-Барбара».
20.40. «Новыя веды аб канцы свету». Дак. фільм.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.15. Крымінальныя паведамленні.
23.25—0.25. Цішыня № 9.

29 кастрычніка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Пейзаж з мэбляй». Мастацкі фільм (Чэха-Славакія).
10.15. Міжнародны фестываль фальклору «Жыцень». Частка 2-я.
11.20—12.20. Футбол. Зборная Беларусі — зборная Украіны. Чвэрць гадзіны пасля матча.
16.30. Прыродазнаўства. 3-ці клас.
16.50. «Доктар Айбаліт». Мультфільмы 3—7-ы.
17.45. Для школьнікаў. Скарбы беларускай гісторыі.
18.00. «Шлях на Евіна». Дак. фільм.
18.20. Якія мы гаспадары? Мінскі аўтазавод.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Як пачаць уласную справу. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.45. З музыкай на «Вы». Другое дыханне шэдэўра.
20.15. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Справа выпадку. Латарэя ўдачы.
21.30. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння—студыя «Сэнс» у Маларыцкім раёне; НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. Футбол. Міжнародная сустрэча. Зборная Беларусі — зборная Украіны.
10.40. «Знакамітае качаня Цім». Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 3-я серыя.
12.40. «Кабарэ майго жыцця». Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлеміксту.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. Спявае Т. Мацвеева.
16.20. ...Да 16 і старэйшым.
17.00. Навіны.
17.25. «Вагон 03».
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. «Вялікая прагулка».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Лато «Мільён».
21.10. Дак. фільм «Наменклатура».
22.30. «Музыка ў эфіры».
23.00. Навіны.
23.30. «Музыка ў эфіры». 2-я частка.
0.55—2.15. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 3-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Камера даследуе мінулае. «Новыя веды аб канцы свету».
9.10. Вольны час. «Увага: здымаю!»
9.25. Сам сабе рэжысёр.
9.55. «Караван».
10.25. Непазнаны Сусвет.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Пілігрым.
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Вучыцца рынку.
15.30. Студыя «Рост». «Гуфі. геймз». Частка 1-я.
16.00. Там-там-навіны.
16.15. Урал-ТБ.
17.00. Так і жывём.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. «Любімаўка-92». Фестываль маладой драматургіі.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Санта-Барбара».
20.10. У свеце аўта. і мотаспорту.
20.40. Спецыяльны камерцыйны веснік.
20.50. Мультфільм для дарослых «Мары, мары».
21.00. Айчына мая. «Пецярбургскія куткі».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.15—0.45. «Новы ілюзіён».

НА ДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ў Віцебску—ад 0 да 2 градусаў цяпла, у Мінску, Магілёве і Гродна—1—3, Брэсце і Гомелі—2—4 градусы цяпла. У наступныя двое сутак па рэспубліцы часам ападкі. Тэмпература паветра ўначы ад 1 градуса марозу да 4-х цяпла, удзень — 3—8 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

Згубленае пасведчанне ўдзельніка ліквідацыі аварыі на ЧАЭС № 404051, выдадзенае на імя Вярбовікава М. І.,
ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМ.

Згубленае пасведчанне № 394827 удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, выдадзенае на імя Сцепаненка Марыі Самойлаўны,
ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь,
калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЦЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 218.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12